Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 39 (2681) Год LII | Беласток, 30 верасня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Ніэкожыстнэ людзі

— Шкада, што тут усе праваслаўныя. Каб яшчэ быў хоць адзін католік, то тры *ксяндзы* па вуліцы хадзілі б. О, браце! Да чаго дажыліся. *Заоўзе* нам хочуць зрабіць! — пенсіянер Віктар Траяноўскі не можа зразумець, чаму яго невялічкую вуліцу падзялілі на дзве парафіі.

— І навошта яны гэта нам на старасць зрабілі? — пенсіянерка Марыя Катэльчук пачынае плакаць. — Калі я даведалася, што справа ўжо *заклепаная* і няма адвароту, усю ноч не спала.

— А я ўжо другі месяц не магу супакоіцца, — хвалюецца рэнтыстка Марыя Голец. — Падзяллі нас і няма вінаватых! Каго не спытаеш, адзін спіхае віну на другога. А за плячыма смяюцца з нас старых і хворых. Такая праўда!

Больш за сам факт падзелу людзей усхваляваў спосаб, у які царкоўная адміністрацыя вырашыла пытанне прыналежнасці да новай парафіі. Каб усё было ясна — з пачаткам ліпеня г.г. частку вернікаў, без іх згоды і ведама, запісалі ў новую парафію ў Відаве.

* * *

Справа датычыць невялічкай вуліцы Жытняй. Адыходзіць яна ад вуліцы Дубічы, непадалёк белай капліцы і каляровага крыжа ў гонар беларускага асветніка Яраслава Кастыцэвіча. Адсюль дваццаць хвілін пяшком у цэнтр старажытнага Бельска. Першы дом па вул. Жытняй паставіла Марыя Голец у 1967 годзе. Зараз няпарная нумерацыя канчаецца на ліку 15. Ля мураванак, схаваных за высокімі платамі, дагледжаныя агароды з бульбай, слівамі і кветкамі. Ад пачатку, ужо сорак год, тутэйшыя жыхары прыналежылі да Уваскрэсенскага прыхода. У першым пісьме мітрапаліту Саву, у якім жыхары звярнуліся з просьбай вярнуць іх у старую парафію, чытаем:

Jesteśmy mocno, emocjonalnie i duchowo związani z Tą cerkwią. Mury tej cerkwi są naszą podporą w tygodniowej modlitwie. W cerkwi Zmartwychstania Pańskiego modlimy się w czasie wszystkich świąt. W tej parafii nasze dzieci były chrzczone, przystępowały do spowiedzi i pryczasti. Zawierały związki małżeńskie. Cerkiew była świadkiem naszej młodości, a teraz nadchodzącej starości. Cerkiew jest odniesieniem modlitwy. Do niej kierujemy nasze prośby i podziękowania. Cerkiew Ta jest naszym domem Bożym, łączącym nas z prawosławiem. Uczęszczamy do niej systematycznie i modlimy się. Pragniemy wszyscy należeć do Niej? Dlatego bardzo prosimy o uwzględnienie naszej prośby.

(пад лістам падпісалася дзевяць асоб з адрасамі і нумарамі PESEL).

* * *

Праблема ў тым, што падзел на Жытняй ніяк не трымаецца логікі.

Жыхары вуліцы Жытняй у Бельску-Падляшскім не спяць, а толькі плачуць па начах

— Чаму адных адкінулі, а іншых пакінулі? — перажывае ўжо другі месяц пенсіянерка Марыя Голец. У галаву прыходзіць ёй толькі адзін адказ: — Відаць, мы такія *ніэкожыстнэ* людзі. Бо чаму маладых і важнейшых пакінулі пры горадзе, а нас, пенсіянераў, сапхнулі на могілкі ў вёску?!

Сапраўды, сярод прыпісаных да Відава на Жытняй большасць складаюць пенсіянеры. Тры жанчыны ходзяць на кастылях. У новай парафіі апынуліся толькі пяць дамоў з няпарнымі нумарамі. Другі бок вуліцы, з цотнай нумерацыяй, астаўся пры Уваскрэсенскай царкве, што па вул. Траўгута. Спачатку падзел меў ісці па лініі: лішкавыя і цотныя нумары. Аднак і гэты падзел пікантна непаслядоўны. Бо па бельскім баку, значыць, ва Уваскрэсенскай царкве, асталіся тры дамы з няпарнымі нумарамі. Хопіць дадаць, што ў адным з іх жыве намеснік царкоўнага старасты.

— А нас такіх сляпых, глухіх, інвалідаў, — жаліцца пенсіянерка Марыя Катэльчук, — узялі і *адкасалі*. Спадарыня Катэльчук усё жыццё ўспамагала царкоўныя ініцыятывы, з пакорлівасцю падчынялася прыхадскім прынцыпам і абавязкам. І цяпер не разумее што сталася. Чаму яе, інвалідку, якая ледзь-ледзь ходзіць з дапамогай кастылёў, прыпісалі ў царкву, у якую ў два з паловай разы далей, чым у стары прыход. У пенсіянераў няма сваіх машын. А з вул. Жытняй немагчыма дабрацца туды на публічным транспарце.

— Астаецца камашаваць пешшу, — наракаюць мае суразмоўцы, — па *жвіры* і балоце, якое залівае дарогу пасля дажджоў.

— Я гэтага падзелу не разумею, — крыўдуе пенсіянерка Ірэна Дземянчук. — Люзей трэба набліжаць, а не аддаляць ад царквы. А нас звычайна аддалі! І нават не спыталіся ў нас, ці хто згоды?!

* * *

Памыляецца той, хто думае, што ў наш час паўсюднай тэлефанізацыі, лакальна-царкоўна-канцылярскія справы можна камфортна аформіць не выходзячы з хаты. Каб дазваніцца ў Уваскрэсенскую парафію, я сама была вымушана тэлефанаваць у чатыры розныя месцы. Пад афіцыйным нумарам (пададзеным у свецкіх і царкоўных даведніках), азвалася бялышчанка з меладыйным акцэнтам:

— Wie, tam to często zmieniają numer, — сказаў голас у трубцы. Ветлівая цётка прадыктавала мне новы нумар парафіі.

— A czy jeszcze aktualny, to zobaczy.

Пад пададзеным нумарам цягам двух дзён ніхто не падымаў трубку. Урэшце, на трэці дзень, карыстаючыся дапамогай канцылярыі епіскапа, мне пашанцавала дазваніцца на плябанію. Пра справу падзелу на вул. Жытняй у прыходзе не хацелі гаварыць:

— Nastojaciel przebywa w Warszawie w szpitalu, — адказала мне сумным голасам жанчына. — Proszę w tej sprawie rozmawiać z księdzem dziekanem.

Пад афіцыйны нумар ксяндза-дэкана (чытайце: бельскага благачыннага), таксама складана дазваніцца. У час працоўных гадзін (пятніца), ніхто не падымаў трубку (уключаўся адно аўтаадказчык). Калі ў чарговы дзень мне пашан-

працяг ☞ 11

XI Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XI Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на прынтэры або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149** з прыпіскай на канверце: XI Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **16 лістапада 2007 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2007 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі вартасныя ўзнагароды.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

Сакратарыят конкурсу:
Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 085 743 50 22.

Конкурс праводзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Восеньская загадка

Што найцяжэй паддаецца зменам, дык гэта стэрэатыпнасць мышлення. Як гаворыцца, быццё вызначае свядомасць. Ну а некаторыя людзі хіба што створаныя менавіта для таго, каб даказаць сваім прыкладам праўдзівасць гэтага выслоўя. Некалі даўно пачуў я анекдот пра тое, як дзеда спыталі як бы ён стаў жыць, каб яму далі мільён долараў. „Ото ж я зажыў бы! — адказвае дзед. — Саломы ў хаце пасцяліў бы аж па самы вокны. Хлебам ужо не харчаваўся б. Еў бы сала з салам. А бабе сваёй загадаў бы, каб печку паліла толькі габляванымі дошкамі". А яго пытаюць навошта агонь карміць дарагімі будаўнічымі матэрыяламі, якія, яшчэ ў дадатак, цяпла даюць менш, чым нікому непатрэбны танны корч. „Дык у мяне ж цэлы мільён, — адказвае дзед. — Куды ж мне яго дзець?"

Ну і халера з ім, з тым дзедам. Персанаж міфічны і камічна-трагічны, бо анекдатычны. Кожны скажа што ён, той дзед, дурань. А вось калі ён не дзед, а высокапастаўлены чыноўнік, або палітык, тады ягонае распальванне печкі габляванымі дошкамі чамусьці ўспрымаюць як мудры палітычны крок. І на поўным сур'ёзе людзі, нібыта разумныя, пачынаюць абмяркоўваць ці ўдалы той крок і ці прынёс якія дывідэнды. Ды і дывідэнды, папраўдзе, многіх цікавяць выключна з тэарэтычнай кропкі гледжання. Не так важны вынік, як сам працэс. Як казаў яшчэ адзін трагікамічны персанаж палкоўнік Храк: „Вайна няважна, важнае манеўры".

Ужо каторы год на Беларусі ладзіцца свята „Дажынкі", так званы дзень работніка палёў. Сцэнарый такі ж, як і раней: будзе ў нейкім горадзе рамонт, папраўяць дарогі, пафарбуюць фасады, паставяць на цэнтральнай плошчы насціл, з якога будуць выступаць прэзідэнт краіны і мастацкія калектывы. Узнагародзяць нейкую колькасць камбайнераў ды іншых спецыялістаў сельскай гаспадаркі, пахваляцца поспехамі і раз'едуцца па хатах. А да гэтага начальнік краіны то на верталёце, то яшчэ якім транспартам аб'едзе калгасы ды правядзе селектарныя нарады, падчас якіх дасць спецыялістам сельскай гаспадаркі парады як правільна змагацца за ўраджай. Вялікая колькасць гаспадарнікаў будуць уважліва слухаць тыя парады ды занатоўваць і ніхто з іх не адважыцца сказаць, што гэта менавіта яны спецыялісты па сельскай гаспадарцы і гэта іх абавязак даваць парады. А яшчэ большая колькасць тэле- і газетных каментатараў будуць пра тое пісаць у газетах і паказваць па тэлебачанні, падаючы гэты факт так, што складваецца ўражанне, што без прэзідэнта зерне не сабралі б, не справіліся б.

Уявіць сабе цяжка, каб прэзідэнт, прыкладам, Злучаных Штатаў Амерыкі даваў парады фермерам як сабраць ураджай. Ды не толькі прэзідэнт ЗША. Здаецца і суседнія лідэры, ні польскі, ні літоўскі кіраўнік у справы гаспадароў не ўмешваецца. А калі б умяшаўся хто з іх, то разбамбілі б яго мясцовыя журналісты. Няўжо, спыталі б яны, прэзідэнту няма чым больш займацца? І няўжо справы ў краіне аж настолькі кепскія, што больш няма на каго, як толькі на першую асобу краіны, разлічваць у справе капання бульбы? Хіба цяжка было б там гэтым людзям выйграць наступныя выбары.

Але ж, успомнім яшчэ раз, быццё вызначае свядомасць. А калі быццё, той лад, які быў закладзены яшчэ пры СССР у краіне не мяняецца, то і не мяняецца свядомасць. І дзяржаўны беларускі журналіст не тое што верыць да канца, але пераконвае сябе ды іншых, што місія журналістыкі хваліць поспехі ўлады. Як поспехі цяжка знайсці, то хваліць само жаданне іх зрабіць і шлях, на якім тыя поспехі шукаюцца. А крытыкаваць нельга. Ды і не пахваляць за гэта. Хіба апошні аргумент самы галоўны.

Ну, але да ўраджаю. Ехаў я неяк з сябрам з Літвы па беларускай зямлі. Ён быў вельмі ўражаны парадкам на палях. Кожны кавалачак зямлі апрацаваны. Усё недзе расце. А ў Літве ў гэты час палова зямель пустуе ды зарастае травой. З першага позірку такая сістэма вядзення гаспадаркі як на Беларусі здалася лепшай. Ды і ў газетах усё так распісана ды нахвалена. Можа і праўду кажуць тыя журналісты. Так мы з ім і развіталіся.

А пасля тэлефануе ён мне з Вільні ды кажа: „Загадаю я табе загадку, а ты паспрабуй яе адгадаць з трох разоў. Як так атрымліваецца, што ў нас шмат зямлі пустуе, а ў вас практычна ўсё апрацавана, але чамусьці гэта мы, а не вы, прадаём зерне за мяжу, а кошты на сельгаспрадукцыю ў нас таксама таннейшыя чым вашы?"

Віктар САЗОНАЎ

Глыбокая плынь

Калі спыталіся ў мяне пра мастацкія імпульсы, якія мною кіравалі, пра мае захапленнні ці ўзоры ў паэзіі, найчасцей падаваў я прыклады французскага сюррэалізму, хоць бы паэзіі Поля Элюара або Анры Мішо, а таксама расійскага акмеізму, як Восіпа Мандэльштама, а з беларускіх паэтаў спасылаўся я на прыклад Максіма Багдановіча; дарэчы, прэзентацыю твораў і створаныя светы мог бы я пашыраць, паколькі разам з новай, чарговай хваляй часапрасторы мае густы змяняліся, да таго кожны сур'ёзны творца ад чужых узораў павінен аддаліцца нібыта ад берага...

Я не раз забываўся аб моцным уплыве, якім было кіно, мастацтва кіно, фільмавая ўява, значыць, магія карцін адсвечваючыхся на белым экране. Прыклікаю з тхлані памяці цёмную зальку кіно фільматэкі, куды заглядваў я ў студэнцкі час у Варшаве. Я, як і іншыя заўзятары, якіх звалі з французскага „пацукамі фільматэк", патрапілі няраз на працягу дня паглядзець пяць рэдкіх фільмаў, якія ў нармальных кінатэатрах, не гаворачы ўжо аб тэлебачанні, немагчыма было ўбачыць. Дзякуючы фільматэцы можна было „залічыць" амаль усю фільмавую класіку; і нямыя фільмы французскага ці савецкага авангарда дваццатых гадоў мінулага стагоддзя або нямецкага экспрэсіянізму ці амерыканскія крымінальныя фільмы з віду „noir" саракавых гадоў.

Праблема імпульсу, абуджэння ўявы прыйшлі мне на думку ў сувязі з фільмам бразільскага рэжысёра Вальтэра Салерса „Матацыклавыя дзённікі", які я нядаўна паглядзеў. Фільм паражвае сапраўды містычным вобразам Лацінскай Амерыкі, шляхам крэацыі пры дапамозе рухомай фатаграфіі яе прасторы разам з яе людам, асабліва бедным людам. Змест фільма больш-менш такі. Двух маладых аргенцінцаў выбраліся на матацыкле ў падарожжа ўглыб, але і навокал кантынента, каб зблізку спазнаць, сутыкнуцца з аўтэнтычным бытам жыхароў, паколькі юнакі паходзілі з інтэлігенцкіх дамоў і не ведалі праблем свайго кантынента, адгароджаныя ад вонкавага свету добрай выхаванасцю ці, як калісь казалі, класавым эгаізмам. Гэтае падарожжа аказалася быць школай жыцця, якое выявілася ва ўсёй паўнаце, ва ўсёй татальнасці, без заслон, у захапляючай красе і нялюдскай нэндзы.

Ёсць, аднак, нейкае „але", якое мне, сведку XX стагоддзя, ва ўспрыняцці гэтага пекнага фільма мяшала. Адзін з пары гэтых герояў-ідэалістаў быў гэта ж Эрнеста Чэ Гевара, адзін з правадыроў рэвалюцыі на Кубе, дык вось фільм Салеса ўключае ў сабе апісанне прыгод сапраўднай, гістарычнай персоны. Біяграфічных фільмаў ведалі мы шмат і многія з іх варты памяці, як, напрыклад, „Малады Лінкальн" вядучага рэжысёра ЗША Джона Форда. Таксама кінематаграфія былога СССР ахвотна выпускала ў свет карціны пра герояў і каралёў народаў пражываючых на тэрыторыі дзяржавы, а таксмама фільмы прысвечаныя героям рэвалюцыі. Прынамсі фільм „Іван Грозны" Сяргея Эйзенштэйна лічыцца тэарэтыкамі фільмавага мастацтва шэдэўрам.

Назіраю, як у самай новай культуры набірае моцы, а дзякуючы ўсчыненаму шуму становіцца бачным у медыях і ахвотна каменціраваным від неасацрэалізму, якому спадарожнічаюць постмадэрнізм і контрмастацтва. Варта прыгадаць, што перад надыходзячай „дэгуманізацыяй мастацтва" асцерагаў яшчэ ў дваццатыя гады мінулага стагоддзя іспанскі філосаф Хасэ Артэга і Гасет. У шэрагу гучных фільмаў праяўляецца гэта абыякавасцю да фільмавай карціны, формы выказвання, а часам нават найбольш звычайнай здымачнай тэхнікі. Гэтыя фільмы прапануюць затое г.зв. грамадскі змест, маюць відавочную накіраванасць, педагагічнасць, а на практыцы значыць гэта антыкапіталістычную, лявацкую тэндэнцыю, крытычную да прынцыпаў абавязваючых у краінах дэмакратыі заходняга тыпу.

(працяг будзе)

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Місіі АБСЕ — не!

Што і руш у прадуктовых крамах натыкаюся я на вырабы з назвамі, якія паказваюць на тое, што гэты ці іншы выраб не з'яўляецца тым, чым ёсць. Складаная справа? Ой, так. Трапляю на крамных паліцах а то на селядца а-ля ласось, а то на сыр — як відна на ўпакоўцы — тыпу пармезан ці фета. Таму не вельмі ведаю, ці той селядзец гэта селядзец, а на колькі той сыр гэта пармезан і фета. У апошні час пачало мне здавацца, што з некаторымі праявамі польскай дэмакратыі справа падобная. Без сумнення, дэмакратыя ў Польшчы ўжо ўгрунтавалася на яе шкілеце, механізмах. Тым не менш некаторыя рашэнні палітыкаў час ад часу наводзяць пытанні аб яе рэальным функцыянаванні ў кантэксце еўрапейскіх стандартаў.

Прыйшло мне ў галаву ў пятніцу, амаль дзень да каляндарнай восені — і, як і выдапала ў пятніцу — пасля закупкі селядца... а-ля ласось, і пасля таго, як дайшла да мяне інфармацыя аб адмове польскім урадам упусціць назіральнікаў Арганізацыі бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе на выбары 21 кастрычніка. Прэс-сакратар урада Ян Дзядзічак так тлумачыў гэтае рашэнне:

— У Польшчы дэмакратыя ўмацаваная. І не бачым падстаў, каб нашы выбары манітараваліся.

Пасля дадаў:

— АБСЕ не паводзіла сябе тактычна. Не можам сабе дазволіць, каб нас трактавалі як краіну Трэцяга свету.

Задзіўляе мяне гэтая пазіцыя, такое мышленне. Цяжка не пагадзіцца з апанентамі гэтага рашэння. Бо калі дэмакратыя ўмацаваная, дык чаго баяцца? Як можна зразумець з выказвання кіраўніка міністэрства замежных спраў Анны Фатыгі, на рашэнне ўрада паўплывалі м.інш. фармальныя прынцыпы, якія можна звесці да сцвярджэння: членскія краіны запрашаюць на выбары місію АБСЕ, а не АБСЕ сама ўпрошваецца. На маю думку, гэта абгрунтаванне нізкага палёту. Здаецца, разумею, што мае на думцы АБСЕ (55 краін). Урэшце ж незачаста ў Еўропе здараюцца датэрміновыя выбары. У выпадку Польшчы прыезд місіі АБСЕ не азначаў бы падрывання дэмакратыі ў Польшчы, ды пільнаванне яе прыспешанага ходу, а таксама сачэнне за выбарчай кампаніяй з усімі магчымымі „хваткамі ніжэй пояса" і эвентуальнымі несумленнымі метадамі схільвання выбаршчыкаў да падтрымкі якогась з камітэтаў.

Рашэнне аб неўпушчэнні місіі АБСЕ вяжацца — на маю думку — з вынікамі, якія могуць стаць элементам, перашкаджаючым у кшталтаванні дэмакратыі хоць бы ў Расіі і Беларусі. Абедзве краіны могуць спаслацца на прыклад Польшчы, удзельніцы ЕС. Дарэчы, што цікавае, у час апошніх выбараў Аляксандр Лукашэнка, хоць з неахвотнай і ў абмежаваным сабою ліку, упусціў назіральнікаў на выбары ў Беларусі. Аднак ужо чую прыдзірлівы, прапагандысцкі тон беларускага прэзідэнта, накіраваны супраць Польшчы і ўсяе Заходняй Еўропы, „навяртаючай" Беларусь на дэмакратыю. Калі Польшча будзе трымацца сваёй пазіцыі, не будзе мець права на патрабаванне таго, каб яе грамадзяне ўдзельнічалі ў назіральніцкіх місіях у гэтай краіне, а раней у Расіі.

І ўрэшце на канец. Прэцэдэнтае рашэнне аб неўпушчэнні назіральнікаў было ўчынена ў Варшаве, дзе размяшчаецца Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ (ODIHR), якое каардынуе назіранне за выбарамі. Можна апасацца, што ў сувязі з апошнім рашэннем польскага ўрада будзе яно перанесена. Можа, у Вену, у цэнтральнае кіраўніцтва АБСЕ, чаго патрабуе Расія. Гэтае бюро было ў Варшаве, паколькі АБСЕ такім чынам хацела паказаць свае адносіны да факту, што ў Польшчы былі праведзены першыя свабодныя выбары ў посткамуністычнай Еўропе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Расследванне „Нівы"

Філалогія ці наша фобія?

— Гэта не сакрэт, што ў гэтым навучальным годзе, які пачнецца 1 кастрычніка, сітуацыя на беларускай філалогіі не вельмі добрая, можна сказаць, што нават кепская, — прызнае Васіль Сегень, прадэкан па студэнцкіх і дыдактычных справах Усходнеславянскай філалогіі Універсітэта ў Беластоку. Усё паказвае, што першага курса ў нас не будзе з-за таго, што не набралася патрэбная колькасць кандыдатаў. Трэба біцца ў грудзі і прызнаць, што мы празявалі пэўны час тут, ва універсітэце. Былі раней спробы шырэйшага профілю, тады беларусістыкі, што карысталася большым зацікаўленнем. Па розных прычынах, пра якія не хачу гаварыць, гэта памянялася.

Я наведала доктара Сегеня ў апошні дзень прымання дакументаў у пятніцу 14 верасня.

Сем гадоў таму, выбіраючы факультэт у вышэйшай навучальнай установе, я нават не задумалася над альтэрнатывай, якая для многіх была тады паратункам: для адных — перад абавязковай вайсковай службай, для другіх — перад платнай навукай у ВНУ, а для іншых — лёгкім спосабам здабыць магістэрскае званне. Мне здавалася, што пасля беларускага ліцэя шкада ісці на беларускую філалогію, што ёсць шмат іншых магчымасцей самаразвіцця, а беларускай мовай і так буду карыстацца ў жыцці, у размовах з сябрамі, бабуляй, дзедам, часам бацькамі. Не думала я нават, што буду працаваць у беларускім штотыднёвіку, дзе мова з'яўляецца асноўнай справай. Але нават цяпер не жаль мне таго, што я не закончыла беларускай філалогіі. Што я думаю пра вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці беларуская мова? Усё ж такі яна неабходная! Няма тут ніякай супярэчнасці. Чамусьці людзі паступаюць на польскую, нямецкую, англійскую, а нават венгерскую філалогіі. Часам дзеля пазнання мовы, часам галоўным стымулам з'яўляецца культура. Калі ёсць жадаючыя, публічныя ўстановы павінны забяспечыць ім гэтую магчымасць, тым болей што цікаўнасць да Беларусі і яе культуры ўсё ж такі вялікая. Адно прымушае мяне задумацца: чаму на хвалі зацікаўлення на працягу апошніх гадоў колькасць кандыдатаў на беларускія філалогіі змяншаецца? Не было б яшчэ прычын для непасрэднага непакою, калі б не факт, што ў гэтым годзе не будзе першага курса беларускай філалогіі, але не ў Варшаве ці іншым аддаленым горадзе, а ў Беластоку!

Можа студэнтам гэта абыякава, бо заўсёды знойдуць яны сабе альтэрнатыву, але павінна гэта зацікавіць напэўна беларускае асяроддзе, бо, перш за ўсё, яму залежыць на пашырэнні ведаў пра беларускасць і ўсё, што можна пад гэтым лозунгам змясціць. На тое і засталіся беларуская філалогія на Універсітэце ў Беластоку ды беларусістыка ў Варшаве. Аднак чамусьці пагроза спынення дзейнасці вісіць над беластоцкай філалагічнай адзінкай, а не над крыху больш эластычным па пару прычынах варшаўскім факультэтам. Прабавала я ў розных крыніцах знайсці адказ чаму так адбываецца і, здаецца, не так цяжка здагадацца, дзе прычына такога становішча. Але калі гэта не так цяжка, дык чаму яшчэ ніхто яго не выправіў? А можа знайсці адказ не так і проста?

Васіль Сегень — прадэкан па студэнцкіх і дыдактычных справах Усходнеславянскай філалогіі Універсітэта ў Беластоку

Адважныя і рашучыя не прападуць

Сённяшні час не спрыяе гуманітарным навукам. Ад адукацыі чакаецца канкрэтная прафесія, якую даюць тэхнічныя і ім падобныя ўстановы. Цяжка маладым сур'ёзна думаць пра будучыню пры ідэі пяцігадовай гульні ў галіне гуманітарных навук. Не забяспечваюць яны хлебам і хутчэй за ўсё дазваляюць рэалізаваць свае патрэбы і зацікаўленні. Праўда здаецца заставацца крыху збоку гэтых перакананняў. Фактычна лягчэй знайсці працу інжынеру, спецыялісту па інфарматыцы, медычнаму кансультанту ці біятэхнолагу. З другога боку нельга забываць, што сёння шырока развіваюцца галіны прамоцыі, рэкламы, медыйныя ды пазаўрадавыя ўстановы. У гэтых выпадках найчасцей чакаецца агульная адукацыя і тут пачынаецца праблема. Філалагічныя факультэты не даюць такой магчымасці, а кажу гэта на аснове свайго вопыту. Мела я магчымасць параўнаць прапановы філалагічных з сацыялагічнымі спецыяльнасцей і, на маю думку, я не мела б такой упэўненасці ў сваіх ведах і падрыхтоўцы пасля заканчэння толькі філалогіі. Філалогія гэта вузкая спецыяльнасць. Загадчыкі Кафедры беларусістыкі Варшаўскага універсітэта заўважылі гэта заранёў і таму студэнты маюць магчымасць паралельна здабыць дыплом філолага па беларускай і польскай мовах. Вядома, што гэта матывавала студэнтаў. Бачу гэта і на прыкладзе ў сваёй сям'і, але ў час навукі аргумент гэты перастае быць так важны. У гэтым кантэксце варта глянуць на профіль студэнтаў і іх патрабаванні. Ёсць розніца паміж студэнтамі ў Варшаве і Беластоку, а нават у Любліне, калі і там была магчымасць вучыцца на беларускай філалогіі. У Беласток, што пацвярджае таксама доктар Васіль Сегень, трапляе адносна найбольш абітурыентаў белліцэяў і свядомых беларусаў. У Варшаве лягчэй сустрэць студэнтаў проста зацікаўленых усходнімі культурамі ці канкрэтна беларускай. Вядома, што трапляюць, тут ужо без розніцы дзе, студэнты, якім не ўдалося паступіць на жаданы факультэт і засталася ім толькі беларуская альтэрнатыва. На маю думку, „беларуская альтэрнатыва" гучыць двудушна, але так яно ёсць сапраўды. Адны з цяжкасцю ідуць праз гады, каб толькі закончыць навуку, іншыя вынаходзяць цікавыя развязкі і на розныя спосабы выкарыстоўваюць свае веды, а перад усім сам факт навукі на беларусістыцы. Але тут, як у выпадку пошукаў працы, рашае індывідуальнасць чалавека, яго вопыт ці спрыт.

— Кандыдат у паліцыю атрымоўвае апытальнік, у якім дэкларуе веданне замежных моў, у гэтым ліку беларускай, пацверджанае сертыфікатам ці прынамсі чацвёркай на дыпломе. Гэта дае кандыдату два дадатковыя балы. Веданне замежных моў заўсёды з'яўляецца козырам, добрым прыкладам чаму з'яўляецца прэсавы афіцэр у Камендатуры паліцыі ў Гайнаўцы. Ён — абітурыент Факультэта рускай і беларускай філалогій у Беластоку. Яго веды дазваляюць перадаваць інфармацыю лакальным медыям на адпаведных мовах, — расказвае прэс-сакратар Ваяводскай камендатуры паліцыі ў Беластоку падінспектар Андрэй Бараноўскі.

Адважныя і рашучыя з дыпломам беларускай філалогіі не прападуць. Пацвярджае гэта Кацярына Бартноўская, абітурыентка і аспірантка Кафедры беларусістыкі Варшаўскага універсітэта:

— Дыплом беларускай філалогіі заўсёды выклікае зацікаўленне і ўсмешку на твары працадаўцаў, — кажа яна.

Гэты факт часта падкрэсліваюць перад усім студэнты з Варшавы. Беластоцкія студэнты, калі не трапляюць на працу ў школу, чаго найчасцей спадзяюцца, не ўмеюць паказаць плюсаў сваёй спецыяльнасці. Праблема і ў падляшскім рынку працы. Вядома, што меншасныя тэмы часта перашкаджаюць, бо Падляшша яшчэ не вырасла з комплексаў.

Прайграны Беласток?

— Не здзіўляе мяне, што студэнты выбіраюць Варшаву. Там больш магчымасцей знайсці працу яшчэ ў час навукі. Прыцягвае таксама аўра сталічнага горада, — дадае Васіль Сегень.

Але гэта, здаецца, шырэйшая праблема, што Беласток не ўмее выкарыстаць сваіх козыраў. Таму і варта спытацца як заахвоціць кандыдатаў да беларусістыкі, калі сістэматычна падае колькасць студэнтаў беларускай філалогіі. Яшчэ нядаўна на беластоцкую кафедру хацела паступаць каля сарака кандыдатаў, а ў Варшаве нават дзве сотні. Сёння ў Беластоку першага курса не будзе, а ў Варшаве лік студэнтаў нязначна перавысіць прадбачаны ліміт і прынятых, у адпаведнасці з магчымасцямі кафедры, будзе каля 46 чалавек. Што гэта абазначае на практыцы? Адказы падобныя.

— Зараз цяжка адназначна вырашыць якія прычыны паўплывалі на такое становішча. Напэўна трэба будзе правесці аналіз, прыняць адпаведныя меры, каб на будучы год неяк выправіць сітуацыю, заахвоціць кандыдатаў, — кажа доктар Сегень. — Мой прыватны ўступны погляд такі, што класічныя філалогіі, асабліва замежныя, а такой для польскіх грамадзян з'яўляецца беларуская мова, на сённяшні дзень не маюць рацыі быту. У сувязі з уваходам Польшчы ў Еўрасаюз і адкрыццём рынкаў працы ўсе шукаюць прафесійнай, тэхнічнай адукацыі, якая ў будучыні прынясе пэўны хлеб. А вось гуманітарныя, у тым ліку філалагічныя спецыяльнасці, менш спрыяюць эканамічным патрэбам. А і ўвогуле наглядаюцца тэндэнцыі ў напрамку інтэрдысцыплінарнай адукацыі, каб гэта не былі толькі вузкія веды, а ў нашым выпадку каб ішлі ў культуралагічны, юрыдычны ці эканамічны бок. Варта, а нават трэба пашыраць праграму беларускай філалогіі. Гэта напэўна будзе адзін з фактараў, які паўплывае на колькасць кандыдатаў.

На праграму канчаткова не наракае Кася Бартноўская, але звяртае ўвагу на важны фактар.

— Сёлета меншае зацікаўленне, таму што адкрыліся новыя факультэты: міжфакультэтныя ўсходнія штудыі ды культуразнаўства Сярэдняй і Усходняй Еўропы. Гэта крыху адцягнула зацікаўленых Усходам і Беларуссю, бо дае інтэрдысцыплінарную адукацыю, але таксама стварае магчымасць ву-

працяг ☞ 5

Нараўчанская гміна

Неактуальныя знакі і дошкі

Нават на адрэзку ваяводскай дарогі з Навасадаў цераз Нараўку, Новае Ляўкова і Бандары ў Юшкаў Груд стаяць неактуальныя дарожныя знакі ды інфармацыйныя табліцы.

Адзін асцерагальны знак, пад ім дошка з надпісам: „Ubytki i wyboje — 8 km" стаіць з вясны мінулага года ў Плянце. На гэтай дарозе каля Смольніцы паклалі новы роўны асфальт на 2-кіламетравым адрэзку, а затым яшчэ ў адным месцы. Дошкі аднак не памянялі.

У Новым Ляўкове год таму ў верасні закрылі бензастанцыю. Інфармуючыя пра яе дошкі на абочыне дарогі асталіся па сённяшні дзень. Яны стаяць з боку Бандароў і з боку Нараўкі.

Усе гэтыя знакі і дошкі толькі дэзінфармуюць праязджаючых сюдою вадзіцеляў самаходаў. Чаму б іх не забраць?

Там нішчэюць — тут прыдаліся б

У Нараўцы (Гайнаўскі павет) ліквідавалі прадшколле. На пляцоўцы за будынкам асталіся гойданкі, драбінкі, „конікі" і іншыя прылады для дзіцячых гульняў на свежым паветры. Яны нішчэюць.

Сёлета з вясны дзейнічае Клуб прадшкольніка ў Старым Ляўкове. Ён будзе існаваць і ў будучым годзе. Радныя Нараўчанскай гміны далі на гэта згоду, іх прапанова будзе ажыццяўляцца. Таму гэтыя забаўляльныя прылады можна было б перавезці з Нараўкі ў Старое Ляўкова. Варта падумаць. Малалеткі са Старога Ляўкова будуць удзячныя гмінным уладам.

Менш дрэў у Нараўцы

19 верасня г.г. ссеклі восем ліпаў па вуліцы Міцкевіча ў Нараўцы, у тым ліку дзве прыгожыя, купчастыя. Неўзабаве пакладуць тут тратуар. А тратуараў у Нараўцы пабудавалі шмат. Яны роўныя, чыстыя. Цяпер іх амаль штодзень замятаюць г.зв. інтэрвенцыйныя рабочыя.

Дрэвы ссеклі побач дома мясцовага солтыса. Па ўсяму відаць, што ён не пратэставаў. Сякуць, дык няхай сякуць. Гэтак жа абыякавы і іншыя жыхары Нараўкі.

А зараз дрэў у Нараўцы мала. Многа іх ссеклі па вул. Гайнаўскай і Міцкевіча. Новых, маладых дрэўцаў не садзяць.

Гайнаўка

Сухія дрэвы

Два сухія дрэвы стаяць перад і тут жа за галоўнай брамай Мэблевай фабрыкі „Фортэ" ў Гайнаўцы, па вул. 3 Мая. Няўжо ў гэтай фірме не знойдзецца піла, каб іх ссячы?

Кожны дзень праходзяць сюдою рабочыя прадпрыемства. Некаторыя з іх пакідаюць тут свае аўтамабілі на аўтастаянцы. Ці яны не заўважаюць сухіх мёртвых дрэў?

(мох)

Культура ў Дубічах-Царкоўных

Размова з Іалантай СОХАЙ, дырэктарам Гміннага асяродка культуры, спорту і рэкрэацыі ў Дубічах-Царкоўных.

— ***Якія найважнейшыя ў гадавым маштабе мерапрыемствы праводзіць Ваша ўстанова?***

— Гэта фэст „На Івана, на Купала", які ладзім з Саюзам украінцаў Падляшша ў пачатку ліпеня, з суботы на нядзелю ад 19-й да 3-й гадзіны; сёлета сабраў ён каля 10 тысяч удзельнікаў.

У жніўні ў нашым плане заўсёды быў беларускі культурны фэст, але ад двух гадоў ён не атрымліваецца.

У чэрвені арганізуем двухдзённы ваяводскі турнір па стаклетачных шашках, аднак сёлета ён адбудзецца ў верасні. Збірае ён ад дваццаці да трыццаці ўдзельнікаў, а яго галоўным арганізатарам з'яўляецца Лявон Мікуліч з Карыцкаў. Ён вядзе ў нас шашачны і шахматны гурткі. Турнір адбываецца ў дзвюх катэгорыях: адну складаюць дарослыя, а другую моладзь. Шашачны турнір адбываецца ў аб'ектах Гміннага асяродка культуры, спорту і рэкрэацыі, а шахматысты праводзяць турнір у школьных памяшканнях, часта ў гімнастычнай зале.

У калядны час разам з Гміннай управай і Гмінным асяродкам сацыяльнай дапамогі арганізуем Куццю для адзінокіх асоб з тэрыторыі нашай гміны ды для малодшых навагоднюю забаву.

Далей праводзім агляд калядак, у якім прымае ўдзел мясцовая моладзь. Дарослых цяжка прыцягнуць да гэтакай актыўнасці — раз адно ўдалося завезці старэйшых жанчын з царкоўнага хору на агляд у Гайнаўку. Моладзь жа выступае і ў шматлікіх групах каляднікаў, і сола. Усіх разам бывае пад пяцьдзесят удзельнікаў: ад дашкольнікаў да гімназістаў. Заахвочваем усіх навучэнцаў нашых асветных устаноў.

Сёлета наш асяродак рэалізуе шмат праектаў. Галоўны націск ставім на дзейнасць г.зв. мясцовых груп. Гэта перш за ўсё праект для жанчын „ZADRA" (Zadbana, Aktywna, Doświadczona, Rodzinna, Atrakcyjna). Гэты наш праект атрымаў найвышэйшую ацэнку ў нашым павеце. Жанчыны ўдзельнічаюць у занятках фітнэс, знаёмяцца з тайнамі касметалогіі (як класці маскі, якія прымяняць для гэтага крэмы), пазнаюць азы кулінарнага мастацтва. Сустракаемся за вогнішчам, пад музыку. Ладзім экскурсіі, напрыклад, у тэатр у Варшаву, на садаводчы кірмаш у Шэпятова, праводзім конкурсы на найпрыгажэйшы агародчык. Падбадзёрваем сябе, здабываючы веды, якія можна паказаць іншым.

Чарговы праект „Po nitce do kłębka" таксама скіраваны да жанчын і пачынаем яго ў верасні. Хочам гэтакім чынам стварыць групу пажылых, спрактыкаваных жанчын, якая зацікавіць сваімі практычнымі ведамі малодшае пакаленне. Базу для гэтага маем: гэта і Рэгіянальная ізба з выстаўкай прадметаў мясцовага побыту, гэта і Зал традыцыі ў мясцовым пажарным дэпо. Ёсць у нас гатовыя да працы кросны. Ад некалькіх гадоў арганізуем майстар-класы, найчасцей па паперапластыцы, напрыклад, вытворчасць кветак з паперы. Таксама нешта вырабляем з бярозавых ветак ці зайчыкі з сена. Хочам, каб на згаданых кроснах спрактыкаваныя жанчыны паказалі моладзі тканне палавікоў. Гэта ў рамках праекта перадачы мастацкай рукадзельнай спадчыны, бо трэба прыцягнуць у гэтую сферу маладое пакаленне, каб разам згуртавацца. І спачатку будуць сустрэчы са старэйшымі жанчынамі, а пасля творчыя групы. Будуць выезды і ў іншыя мясцовасці, і ў музеі — дзеля азнаямлення і з іншымі народнымі традыцыямі. Бывае, што ладзяцца майстар-класы з вонкавымі спецыялістамі, якім трэба плаціць. А я хачу, каб пакарыстацца сваімі ўмельцамі, тады і грош тут астанецца. Майстэрства нашых рукадзельніц глядзелі ўжо госці з Германіі, Францыі, Беларусі, былі ў нас і вучні Пачатковай школы н-р 2 у Гайнаўцы, якія ў рамках праграмы „Socrates" прымалі немцаў, французаў і румынаў.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

На працягу пяці месяцаў — ад мая да верасня — вядзем адпачынкавы цэнтр Бахматы, у якім маем 32 начлежныя месцы; пачынаем з доўгага майскага уік-энду. Два месяцы доўжацца там бівакі для моладзі з Бельскага і Гайнаўскага паветаў. Адбываюцца яны не толькі па уік-эндах, але і ў будзённыя дні ад панядзелка да пятніцы. Дзеці ў той час рэалізуюць нарыхтаваныя настаўнікамі праграмы, катаюцца на водных веласіпедах, гуляюць за вогнішчам. Апрача таго знаёмяцца з мясцовасцю, з нашай культурнай прапановай, з ландшафтным паркам, удзельнічаюць у сустрэчах і майстар-класах. Бо згаданыя месяцы, хаця яны не ў канікульны перыяд, у школах бываюць месяцамі выязнымі.

А ўжо ў час канікул падаюцца да нас турысты. Сярэдні каэфіцыент выкарыстання нашых месц — каля 60% і залежыць ён ад надвор'я. Прымаем гасцей з Варшавы, Беластока, амаль з усёй краіны, нават з Вроцлава. Большасць з іх з'яўляецца пастаяннымі карыстальнікамі нашых аб'ектаў.

Вось, адзін з нашых гасцей праводзіў тут канікулы з сямігадовага ўзросту. І цяпер, калі пасталеў, купіў сабе ўчастак, пабудаваў на ім хатку. А мы адзін з домікаў, дзе ягоная сям'я заўсёды праводзіла канікулы, назвалі ад ягонага імені Мацееўкай.

У летні перыяд арганізуем пляж з купаннем і з ратаўніком, кожныя два тыдні правяраем ваду. Некалькі домікаў на Бахматах прымаюць гасцей круглагадова. Даем рэкламу ў Інтэрнэт і ў газеты, галоўным чынам у напрамку Сілезіі і Варшавы.

Разам з мясцовай часцю Пагранаховы ладзім спаборніцтвы вудзільшчыкаў; сёлета такія адбыліся ў маі. Таксама ў маі арганізавалі мы гмінныя спаборніцтвы пажарнікаў. У летні перыяд ладзім чэмпіянат гміны пяціасабовых футбольных каманд.

Двойчы — летам і зімою — ладзім майстар-класы нашаму 13-асабоваму гуртку „Струмок" з выездамі навонкі нашай гміны, напрыклад, сёлета быў гэта выезд на Мазуры, раней ездзілі ў Белавежу і на Семяноўскае вадасховішча. Такія паездкі гуртуюць калектыў, цэментуюць яго.

Супрацоўнічаем з бібліятэкай, дапамагаем сабе. Наш асяродак вядзе на Бахматах гаспадарчую дзейнасць, ад якой мае прыбытак і з гэтых сродкаў мы можам дафінансоўваць некаторыя мерапрыемствы, што праводзіць наша бібліятэка.

Усе нашы супольныя з бібліятэкай праекты звязаны з нашай традыцыяй. Хочам таксама, каб наша Рэгіянальная ізба стала на самастойны шлях, каб была заўсёды адкрыта, асабліва ў летні сезон для зацікаўленых турыстаў.

— ***А ці ў Вас працуюць нейкія дзіцячыя адукацыйна-тэматычныя гурткі?***

— Гэтакіх тыповых, кшталту музычных ці мастацкіх, у нас няма.

— ***У якіх аб'ектах працуе Ваш асяродак?***

— Гэта наш будынак у Дубічах, які цяпер рамантуецца ў рамках праекта аднаўлення вёскі. Рамонт пачаўся ў красавіку і прадбачваем яго заканчэнне ў лістападзе. Гэта таксама адпачынкавы цэнтр на Бахматах.

— ***У якіх вёсках Дубіцкай гміны працуюць святліцы?***

— Святліцы не падлягаюць пад наш асяродак. У гміне святліцы ў наступных вёсках: Стары Корнін, Тафілаўцы, Грабавец, Ягаднікі, Елянка, Карыцкі, Войнаўка, Вэрсток, Вітава, Чахі-Арлянскія і Істок. У агульным плане гэтыя аб'екты патрабуюць рамонтаў.

У рамках праграмы „Ocalić od zapomnienia" прыстасавалі мы драўляны будынак, у якім раней была дубіцкая школа, для Рэгіянальнай ізбы; зараз паказваем там скульптуры Мікалая Корха.

— ***А ці маеце дачыненне да аховы помнікаў мінуўшчыны?***

— У гэтай дзялянцы не вядзем самастойнай дзейнасці, толькі супрацоўнічаем з Рэгіянальнай дзелавой групай з Гайнаўкі ў рамках праекта рэгістрацыі помнікаў даўніны.

— ***З якімі суб'ектамі ў Вас найбольш цеснае супрацоўніцтва?***

— Супрацоўнічаем з мясцовай агратурыстычнай суполкай, якая гуртуе за дзесяць кватэр. Добра складваецца супрацоўніцтва з Пагранаховай, з пажарнікамі. Наш войт вельмі прыхільна ставіцца да нашых ініцыятыў. Супрацоўнічаем са згуртаваннем Klanza, якое займаецца з дзецьмі з паталагічных сем'яў. Яшчэ дружым з лесніками і з парафіямі, напрыклад, рыхтуючы калядную вячэру. Мы хочам тут стварыць мясцовае згуртаванне і ўсе нашы дзеянні скіраваны ў гэтым напрамку.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

3 ☞працяг

Філалогія ці наша фобія?

чыцца рускай і ўкраінскай мовам.

А, здаецца, беларуская філалогія патрабуе выйсці з акасцянелых рамаў. Студэнты зачаста скардзяцца на старыя метады, засядзелыя, малакрэатыўныя навуковыя кадры.

— Не помню, каб я мела шанс сустрэць спецыялістаў па сучаснай Беларусі ў час маёй навукі ў Варшаве, — кажа Мартына, якая пабывала на Варшаўскім універсітэце ў рамках праграмы „МОСТ".

Кася Бартноўская, аднак, падкрэслівае цікавую з'яву ў сучаснай адукацыі.

— У ліцэі вучні прывыкаюць, што настаўнікі бегаюць за імі, стараюцца прыцягнуць іхнюю ўвагу. У ВНУ іншыя перадумовы; студэнт сам па сабе зацікаўлены, а дакладчык перадае толькі істотныя веды. Калісь гэта было зразумелае, сёння — не да канца. Трэба шукаць спосабы, каб прыцягнуць і затрымаць студэнтаў, каб не было такой сітуацыі як у Беластоку.

Беларуская „ганарлівасць"

Галоўнае, аднак, каб цяпер пастарацца знайсці выхад з гэтага становішча. Доктар Сегень, здаецца, бачыць выхад.

— Каб выправіць гэтую сітуацыю, трэба пашыраць культуралагічныя веды і апрача паперы, якая можа ў будучыні будзе безкарыснай, варта даць прафесію, якая прыдасца ў пошуках працы. З другога боку нават настаўніцкая падрыхтоўка неабавязковая, а калі яшчэ платная. Але колькі тых настаўнікаў трэба? Стараюся глядзець на гэта ў шырокім плане, каб у праграме было ўсяго пакрысе, але ўсё залежыць ад кадраў. Трэба мераць свае апетыты ў абшарах літаратуры, культуры ці гісторыі на апетыты іншых. Немагчыма разбудаваць праграмы ў вялікую колькасць гадзін, бо студэнты з гэтым не справяцца. Трэба шукаць нейкага пагаднення. З другога боку ў нас замала культуролагаў, прафесараў, спецыялістаў па музыцы, мастацтве і г.д., каб скласці добрую праграму.

Здаецца, аднак, што нейкі час таму прынята было рашэнне аб узбагачэнні адукацыйнай прапановы. На жаль, ідэя Кафедры беларускай культуры ў 2007 годзе здаецца толькі ідэяй, хаця гэтая структура надалей існуе.

— Кафедра ўзнікла таму, што была слушная ідэя, — працягвае доктар Сегень, — нават стварэння інстытута. Але як гэта бывае ў нашым беларускім асяроддзі, асабістыя жаданні, перакананні аб уласнай геніяльнасці бяруць верх, з-за чаго не дайшло да паразумення, канешне, з вялікай крыўдай для беларускай справы ў Польшчы. Каб мы ўсе гаварылі адным голасам, напэўна лягчэй было б дабівацца пэўных спраў у розных установах — гарадскіх і, у шырэйшым плане, дзяржаўных.

Паводле прадэкана гэтая слушная ідэя хутка выгарэла, бо адукацыйныя пытанні пайшлі не ў той бок што трэба:

— Добра, што паўстала такая кафедра, але, прабачце, з цэлай пашанай да гісторыкаў, якія там працуюць, кафедра беларускай культуры павінна мець шырэйшую праграму. Я, як мовавед, не прэтэндую весці заняткі па фалькларыстыцы і, думаю, што мае сябры гісторыкі таксама не прэтэндуюць весці заняткі, не ведаю, па гісторыі мастацтва ці нейкага іншага. Тут была памылка. Добра было б побач гісторыкаў прыняць іншых спецыялістаў, але, на жаль, усё залежыць ад студэнтаў. Калі было б іх многа, тады і працаўнікоў можна было б прыняць больш. Стварэецца такое кола.

Чаму не было стварыць разам Беларускага інстытута? А так установы без студэнтаў

Каго і як вучыць?

Як выпрастаць гэтае кола ў лінію паступовага развіцця? Студэнты з Варшавы звяртаюць увагу на патрэбу пашырэння праграмы, але ў практычным сэнсе не выпадае, каб студэнты канчалі адукацыю, ні разу не пабываўшы ў Беларусі. Студэнты самі ладзяць экскурсіі. Такіх прапаноў не дае вучэльня. У Беластоку зрэдку паяўляецца такая магчымасць, але карыстаюцца ёю толькі тыя найбольш зацікаўленыя. Яны таксама скардзяцца на дрэнна навучаную рускую мову. Увогуле, каб сапраўды пакарыстацца навукай на гэтым факультэце, трэба шмат чаго рабіць самому. Пацвярджаюць гэта актыўныя дзеячы навуковых гурткоў: Мартына з Кракава і Патрык з Варшавы. Гэта таксама паказвае, што ўзровень ангажаванасці студэнтаў там намнога вышэйшы, таму, нягледзячы на недахопы ў кадрах ці праграме, студэнты перадаюць сабе больш пазітыўнай інфармацыі. У Беластоку студэнты амаль увогуле не выказваюцца, філалогію прапануюць найчасцей у выпадку, калі камусьці патрэбны аварыйны выхад. Часам здараюцца свядомыя выбары, выцякаючыя з канкрэтных патрабаванняў, але ж гэта адзінкі. Баліць яшчэ адзін факт. Беластоцкае тэлебачанне доўга шукала супрацоўніка з добрым веданнем беларускай мовы. Не знайшлося ахвотных, хаця не адзін выпускнік чакае добрай, цікавай працы. Аказваецца, што выпускнікі філалогіі вельмі часта не маюць дастатковай практыкі і проста не ўмеюць выказвацца па-беларуску (нягледзячы на факт, што не кожны спраўджаецца ў медыях). Кася Бартноўская прызнае:

— Тое, што студэнты канчаюць філалогію і не ўмеюць гаварыць на беларускай мове здаецца найбольшым паражэннем адукацыі.

Сітуацыю крыху бароніць доктар Сегень:

— Цяжка сказаць, але не хочацца крытыкаваць публічна пэўных сітуацый, аднак не сакрэт, што найлепшыя не трапляюць туды, куды павінны. Можа ў некаторых мала самакрытыцызму. Здаецца ім, што змогуць, а не заўсёды гэта ўдаецца. Мне, як мовазнаўца, цікавіць не толькі тэма, але спосаб, у які падаецца інфармацыя. Праца ў масмедыях гэта няпроста справа.

Але як тут выбараніцца, калі вынікі навучання слабыя, а адсутнасць ахвотных вядзе ў бок спынення працы кафедры. У Варшаве ўсё ж такі Усход прыцягвае, у Беластоку — абазначае дыстанцыю. Можа праблема таксама ў паспяховай прамоцыі?

— Да тэлебачання, шчыра кажучы, я не звяртаўся, — кажа доктар Сегень. — На радыё я асабіста бываў пару разоў і тут вялікае дзякуй журналістам Радыё Беласток і Радыё Рацыя, якія самі звярталіся да нас. Прамоцыя, здаецца, была недастатковай, напэўна была недастатковай. Калі ідзе пра ліцэі, то і прафесар Галіна Твараовіч, і малодшыя працаўнікі, нават студэнтка ездзілі ў белліцэі, хацелі заахвоціць, але вынік такі, які ёсць. Можа варта яшчэ ездзіць і ў іншыя гарадкі, у Саколку ці Дуброву-Беластоцкую. Але галоўная справа гэта праграма, гэта самая лепшая рэклама, каб студэнты перадавалі сабе меркаванні.

Настаўнікі беларускай мовы таксама заахвочваюць сваіх вучняў паступаць на філалогію, але, здаецца, не маюць удалых аргументаў. Ян Карчэўскі з Гайнаўскага белліцэя прызнае, што на філалогію рыхтуецца 8-10 асоб. Загадкай застаецца толькі тое ці выбяруць Варшаву, ці можа Беласток. А можа выбару ўжо не будзе?

Сёння, аднак, павінна турбаваць вось такое пытанне: ці кіраўніцтва кафедры паспее выправіць сітуацыю на будучы год? Часу, як заўсёды, мала. Праекты зменаў пэўна трэба будзе прадставіць найпазней да снежня. Як сказаў доктар Сегень, кіраўніцтва і працаўнікі яшчэ не сустракаліся, але гэтая тэма напэўна будзе ўзнята на першым спатканні.

— Нельга прыкідвацца, што нічога не здарылася, хіба што ў большасці будзе жаданне спыніць дзейнасць кафедры, — дадае прадэкан.

Ці ёсць такая пагроза? Доктар Сегень кажа, што не павінна быць прыхільнікаў спынення дзейнасці кафедры, гэта ж было б сапраўды драматычнае рашэнне. Але з другога боку кафедра гэта таксама месца працы выкладчыкаў. Нам тады астаецца надзея на здаровы розум рашаючых аб лёсах беларускай філалогіі.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Родам з Беласточчыны

Разьбяр па дрэве

У Дзятлаўскім краязнаўчым музеі, што на Гродзеншчыне, адведзены невялікі куток, прысвечаны творчасці беларускага разьбяра па дрэве Уладзіміра Мацюка (1902-1989). Працы яго таксама знаходзяцца ў Расіі ў Дзяржаўным музеі этнаграфіі ў Санкт-Пецярбургу і ў музеях Рэспублікі Беларусь.

Уладзімір Мацюк нарадзіўся ў Беластоку 105 гадоў таму. У сярэдзіне 1940-х гадоў не па сваёй волі з сям'ёй прыйшлося пакінуць родныя мясціны і пераехаць у Дзятлава, дзе і пражыў ён усё сваё астатняе жыццё. З дзяцінства самадзейны мастак захапіўся разьбой па дрэве, бо ўжо ў 1930-40-х гадах удзельнічаў у мастацкіх выставах. У Беларусі яго творы экспанаваліся на розных абласных і рэспубліканскіх выставах, а таксама выставах былога Савецкага Саюза. Многія з іх былі адзначаны прэміямі і дыпломамі.

Асноўная тэматыка твораў Уладзіміра Мацюка (рэльеф, круглая скульптура) — гэта гісторыя беларускага народа, яго сялянская праца, да якой мастак быў бліжэй і добра ведаў. Сама скульптурная

прапрацоўка формы ў работах Уладзіміра Мацюка вылучаецца мноствам дробных парэзаў, якія дапамагалі мастаку выявіць пластыку фігур.

Сярод твораў гэтага таленавітага чалавека, якія захаваліся ў розных музеях, вядомы такія, як напрыклад — „Араты" (1940 г.), „З данясеннем" (1945 г.), „Дудар", „Тры пакаленні ў барацьбе за Радзіму" (абодва ў 1954 г.), „Скончаны працоўны дзень", „Начлег", „Жанчына з граблямі", „Жывёлавод", „Стары на прызбе" (усе 1950-я гады) і многія іншыя працы Уладзіміра Мацюка.

Гэтая невялікая нататка няхай нагадае пра нашага земляка. А раптам нехта яго ўспомніць, а можа ў кагосьці і на Беласточчыне зберагліся яго мастацкія творы з дрэва.

Сяргей ЧЫГРЫН

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

У НАРВЕ Ў ПЯТЫМ КЛАСЕ

Пяты клас з настаўніцай Нінай Абрамюк

Тое, што новае, адразу павінна кінуцца ў вочы. А тут інакш. Спачатку я не прыкмеціла, што ў школьнікаў новая форма. Вучні нарваўскай школы носяць джынсавыя шэра-сінія камізэлькі з эмблемай школы. Яны непрыкметныя, можа таму так карысна ўплываюць на настрой групы.

Спачатку захапіла мяне іншае. У Пачатковай школе ў Нарве на беларускую мову ходзіць ужо кожны другі вучань. У параўнанні з мінулымі гадамі — гэта прагрэс.

— Ёсць у нас пэўны феномен, — кажа настаўніца Ніна Абрамюк.

На ўроках беларускай мовы ходзяць усе дзеці з былой ласінскай школы (тут ёсць толькі адно выключэнне). На ўроках бацькі запісваюць ужо ў першым класе. Гэта працяг слаўнай традыцыі. У самы цяжкі час для беларускага школьніцтва толькі ў Ласінцы і Малінніках 100 працэнтаў школьнікаў вывучала родную мову. З гэтага года ў Нарву дайшлі малодшыя класы з Ласінкі. Зараз на ўсю гміну адна Пачатковая школа (191 вучань).

Разам з Нінай Абрамюк мы завіталі ў пяты клас. Як паказалася, многія дзеці спяваюць у слаўным ласінскім царкоўным хоры „Заранка". Гэта асаблівы клас. На 13 асоб тут 9 хлапцоў. Магчыма таму шмат часу мы прысвяцілі спорту. Хлопцы з Ласінкі самі арганізавалі спартыўную пляцоўку побач царквы. У вольны час гуляюць у футбол:

— А вашы дзяўчаты, — пытаемся, — таксама гуляюць з вамі ў футбол?

— Толькі тады, калі яны самі маюць ахвоту, — кажуць прадстаўнікі мужчынскага полу.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

З кветкамі для Гаўрыіла

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Аляксандра Каленюк, Магда Лешчук і Магдалінка Дробат ды іншыя дзяўчаткі сыпалі з кошычкаў кветкі ў шэсці пад саборам святога Мікалая ў Беластоку

Перад саборам святога Мікалая ў Беластоку пад вечар 21 верасня сабралася шмат народу. Прыйшлі вернікі на памятнае свята не толькі гэтага прыхода, але і ўсіх праваслаўных Беласточчыны: на 15-годдзе перанясення з Гродна на радзіму мошчаў святога дзіцяткі Гаўрыіла. Сярод вернікаў вылучаліся дзеці, якіх заступнікам з'яўляецца гэты святы хлопчык, народжаны 323 гады таму недалёка, у Звярках пад Беластокам, у сям'і Гоўдэляў. Пра ягонае праведнае жыццё, пакутніцкую смерць і святое ўзвышэнне ў Госпада дзеці вывучаюць на ўроках Божага закону ў школе. І вучні прыйшлі ўсімі класамі на набажэнства, з настаўніцамі ды настаўнікамі рэлігіі, з бацькамі. Вылучаліся асабліва дзяўчаткі — урачыста, прыгожа апранутыя, з кошычкамі поўнымі пялёсткаў асенніх кветак. Яны ў шэсці вакол храма будуць сыпаць гэтыя каляровыя пялёсткі на сцежку.

— Мы, вядома, не памятаем моманту, калі мошчы святога дзіцяткі ўрачыста былі прынесены на радзіму, — кажа Магдалінка Дробат, вучаніца III „а" класа ПШ н-р 19 у Беластоку (іх школа размяшчаецца на пасёлку „Пяста"). Чакала яна пачатку багаслужбы разам са школьнымі сяброўкамі, вучаніцамі IV „д" класа, Магдай Лешчук і Аляксандрай Каленюк.

— Нас тады яшчэ не было на свеце! Памятаюць гэта нашы мамы! І з намі тут настаўнік Божага закону, Яраслаў Троц. Ці маем з рэлігіі адны пяцёркі і шасцёркі? Вядома, рэлігія ў школе гэта цікавы прадмет!

(лук)

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЯК НАВУЧЫЦЬ ЛЮБІЦЬ ВІНАГРАД

Сёння гісторыя такая: вельмі любіў Анатолька семкі. Так любіў, што і спаў разам з семкамі, і еў разам з семкамі, і нават калі прыязджаў да знаёмых касманаўтаў на Байканур, — дык і тады запляваў усю ўзлётную пляцоўку чорным шалупіннем ад семак. Ракеты ў той дзень у Космас не паляцелі, а касманаўты з гора напіліся журавіннага морсу з металёвых тубэлачак і пачалі бегаць па той самай узлётнай пляцоўцы ў даганялкі ды абціскалкі.

Карацей, і сам Анатолька не мог даць той сваёй дурной звычцы ніякай рады, і ніхто іншы, акрамя...

— А я ведаю сродак! — усміхнулася адным сонечным днём Вальжынка, якая так часта глядзела на Анатольку пранізліва і неадрыўна...

І вось аднойчы яна паглядзела на яго так, што хлопец спыніўся, таксама паглядзеў на яе..., і раптам моўчкі абтрос са штанцоў шалупінне, моўчкі пайшоў за Вальжынкай, якая павяла яго... Урэшце, якая розніца, куды яна яго павяла?! Ён проста пайшоў за ёю, і ўсё! І з таго самага дня, о, з таго самага дня! Болей не еў, не смеціў абы-дзе і дзе папала сваімі семкамі, а еў выключна зялёны або сіні вінаград. Але! Толькі з Вальжынкай, і толькі тады, калі бралі яны адзін аднаго за рукі. А ўзяўшы, зыходзілі туды... Урэшце, якая розніца, куды яны разам зыходзілі?!

Дык у чым сакрэт таго самага сродка, які ведала цудоўная дзяўчына Вальжынка, спытаеце вы? Аказваецца, няма тут ніякай складанасці. Вазьміце адну вінаградзінку, толькі пажадана самую маленькую, можна нават малюпасенькую, і ўявіце, што побач з вамі... Уявілі? Адчулі смак? Дык што вам цяпер падабаецца лепей: семкі ці вінаград?!

Ваш Дзядзечка Сід
22 верасня 2007 г., Кобрын

ТУТЭЙШЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Дзіця вуліцы

Калі я бачу яго на вуліцы, заўсёды паварочваю ў іншы бок. Усе мае сябры і сяброўкі робяць гэтаксама. Гавару пра найбольшага жуліка ў горадзе, якога мы з сябрамі празываем «дзіцём вуліцы» (хросныя бацькі ахрысцілі яго Паўлам). Ён ніжэйшы за мяне на галаву (мой рост — 167 сантыметраў), хаця неўзабаве яму споўніцца 17 гадоў. Я добра памятаю яго з пачатковай школы. Праз адзін месяц Паўл быў са мною ў адным класе. На жаль, ужо ў кастрычніку навука яму абрыдла, і ён уцякаў з заняткаў. Таму, праз шэсць гадоў, адкуль памятаю, ён быў заўсёды ў першым класе. Калі я стала гімназісткай, часта бачыла Паўла на горадзе. Ён стаяў ля крамы з працягнутай рукой і жабраваў, або размаўляў са зладзеямі. Тады я яшчэ не баялася „дзіцяці вуліцы".

Аднойчы мы з сяброўкамі пайшлі на коўзанку і сустрэлі там Паўла. Ён, відавочна, мяне прыгадаў. Схапіў мяне за руку і спытаў, ці пайду з ім у кіно?! Я вельмі напалохалася. Крыкнула, і быццам апараная, уцякла ад яго. Пасля гэтай прыгоды я і мае сябры пачалі баяцца жуліка. Ды яшчэ Ганка распавяла нам пра досвед сваёй малодшай сястры:

— Зося была ў бальніцы разам з „дзіцём вуліцы", — сказала дзяўчына. — Аднойчы, ноччу, ён увайшоў у яе пакой з нажніцамі і хацеў абрэзаць ёй валасы!

— Жах! — усклікнула Лёля. — Гавары, што было далей?

— Прыбег доктар і забраў з сабой Паўла. Аднак з тае няшчаснай пары мая сястра баіцца спаць адна ў сваім пакоі.

Расказ Ганкі зрабіў сваё. Мы яшчэ больш сталі баяцца „дзіцяці вуліцы". Аднойчы мы выпадкова селі з „першакласнікам" у адзін аўтобус. Мы адразу ўцяклі на канец машыны. Каля нас стаяў старэйшы дзядзька з парасонам, які нехаця штурхануў ім Лёлю. Дзяўчына стала верашчаць, быццам яе мардавалі. Усе людзі ў аўтобусе павярнулі зрок у бок нашай «тройцы».

— Ці ўсё добра?! — пыталі мы з Ганкай бледную як папера Лёлю.

— Я думала, што гэта не парасон, а нож Паўла. Я падумала... што ён хоча мяне забіць! — сказала дзяўчына.

Лёля найбольш з нас баялася „дзіцяці вуліцы". Апошнім часам сустрэла яго ў зусім нечаканым месцы. Жулік стаяў пры яе царкве з працягнутай шапкай і жабраваў. Лёля не ведала, што рабіць: ці крычаць, ці маліцца?!

На шчасце яна была разам з бацькамі, якія пра нішто не ведалі. Яны нават не заўважылі ў яе вачах касмічнага пераляку.

Тэкст:<truskawka9922@tlen.pl>
Дызайн:<lolcia05@tlen.pl>

Вершы Віктара Шведа

Там усюды поўна цудаў

Упершыню ў горад
Сынок паехаў з татам.
І розных цудаў мора
Прывёз адтуль дахаты.

Расказвае ён маці
Аб горадзе, як цудзе:
— Хата стаіць на хаце,
Жывуць на людзях людзі.

Два погляды

Азваўся вучань Лёня:
— У аўтобусе сёння
Мне сталі прыглядацца,
Быццам я еду зайцам.

А я на іх, вядома,
Глядзеў зусім па-другому,
Што няма тут сумненняў —
Маю білет у кішэні.

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Гжэсь Серафін — Гарадок

Эвеліна Дзікоўская — Бельск-Падляшскі

Польска-беларуская крыжаванка № 39



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 35: Праграма, арэх, луг, амяла, пас, грошы, грыва, краса, рыба, аса, боб, кумір, шоу, рута, гітара. Пара, алах, бор, прус, кроў, рэч, грыб, граб, арысак, мова, ура, Яша, амур, малы, сіта, ара, хмара.

Узнагароду, **каляровыя алоўкі**, выйграла **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!

Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі хоча адрадзіць ганчарства ў Кляшчэлях, якія ў мінулым славіліся глінянымі вырабамі. Ёсць таксама задума намеціць па Белавежскай пушчы і яе наваколлі культурны шлях...

Лепка пад музыку

Дажджлівае і халоднае надвор'е, якое летам часта перапляталася з сонечнымі днямі, палохала аматараў адпачынку на прыродзе. У верасні яшчэ цяжэй, чым у час канікулаў, падабраць добрую дату для мерапрыемстваў на свежым паветры. Пераканаліся аб гэтым арганізатары Археалагічнага фэсту ў Збучы і Беларускага этнаграфічнага фэсту ў Гайнаўцы, у час якіх было захаладна на даўжэйшы адпачынак пад адкрытым небам. Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы яшчэ перад летнімі мерапрыемствамі інфармаваў, што ў выпадку дрэннага надвор'я будуць яны ладзіцца ў вялікім музейным будынку. Так было і з этнаграфічным фэстам, які музейнае аб'яднанне наладзіла 16 верасня. Мерапрыемства не адбылося традыцыйна на музейных сходах, толькі ў кіназале, дзе выступілі музычныя калектывы, і на музейных калідорах, дзе маладыя і старэйшыя ўдзельнікі фэсту паспрабавалі ляпіць вырабы з гліны.

Вучні з гуртка „Дэфармацыя"

На беларускім фэсце

Апошнім часам на Гайнаўшчыне пачалі ладзіцца культурныя мерапрыемствы, у час якіх арганізатары сталі спасылацца на шматкультурнасць рэгіёна і запрашаць на іх, побач беларускіх калектываў ці мастакоў, гурты і індывідуальных удзельнікаў з Украіны і выканаўцаў з аддаленых гарадоў Польшчы. Гэтым шляхам не пайшоў гайнаўскі музей, які ў назву свайго этнаграфічнага фэсту занёс слова „беларускі". Калектывы, якія выступілі перад музейнай публікай („Збучанкі", „На мяжы", які дзейнічае пры Беларускім музеі, „Маланка" і „Зорка"), праспявалі разнародныя песні. Побач беларускіх эстрадных твораў прэзентавалі яны народныя песні Гайнаўшчыны і Бельшчыны ды агульнавядомыя ўкраінскія песні. Было таксама некалькі рускіх песень (накіраваных перад усім да старэйшай публікі), якія спяваліся ў нас у пяцідзесятыя-шасцідзесятыя гады.

Ляпілі з гліны

Больш моладзі і дзетак заўважыў я на музейных калідорах. Вучні, якія займаюцца ў святліцы ў Ляўкове, прыехалі з гатовымі вырабамі з гліны і за падрыхтаванымі загадзя сталамі сталі ляпіць нешта новае. Іх працы сталі прыглядацца людзі, якія не памясціліся ў кіназале і стаялі каля ўваходных дзвярэй. Падыходзілі новыя наведвальнікі, фатаграфавалі вучняў, распытвалі пра іх зацікаўленні.

— Заняткі з глінай нам падабаюцца, яны нас супакойваюць, — сказала Барбара Лукша.

— Я найбольш люблю рабіць сэрцайкі, якія пасля дару блізкім, — заяўляе адна з малодшых удзельніц заняткаў Караліна Рэент. Юлія Харашэўская жыве побач пушчы і любіць ляпіць лясную жывёлу, якую можа ўбачыць на прыродзе.

— Калі дзеткі лепяць з гліны, развіваюць мануальныя і эстэтычныя ўмеласці, вучацца таксама цярплівасці, бо хутка не зробіш гатовага вырабу. Гліну бярэм з нашага Прадпрыемства будаўнічай керамікі, дзе таксама выпальваем нашы вырабы, — паінфармавала Лена Рэент, апякунка заняткаў у Ляўкове, якая вядзе іх разам з Вольгай Максімюк. Нядаўна дзеткі з Ляўкова занялі трэцяе месца ў Міжнародным конкурсе лепкі з гліны ў Эльблангу.

За даўжэйшым сталом сабралася яшчэ больш дзетак і моладзі з Гайнаўкі, што лепяць вырабы з гліны ў рамках заняткаў гуртка „Дэфармацыя", які дзейнічае ў Гайнаўскім доме культуры. Сярод іх вырабаў я заўважыў многа цікавых прац з людскімі постацямі.

— У час уступных экзаменаў у сярэднія мастацкія школы патрабуецца ляпіць постаці ў руху і таму ў час заняткаў са старэйшымі вучнямі мы часта працуем па гэтай тэме. Малодшыя дзеткі выконваюць прасцейшыя прадметы з гліны, якія пасля засыхаюць. Няма ў нас магчымасцей іх выпальваць, — заявіла інструктар ГДК Зінаіда Якуць, апякунка гуртка „Дэфармацыя".

Вяртанне да традыцыі

Вядучыя мерапрыемства намеснік старшыні музейнага аб'яднання Ян Карчэўскі і бібліятэкарка Анджаліна Масальская гаварылі пра гліну і гліняныя вырабы, а на вялікім уваходным музейным калідоры разлажыў свае збанкі і іншы даўні гліняны посуд народны мастак з Чорнай-Вёскі-Касцельнай. Аказалася, што са славутых кляшчэлеўскіх рамеснікаў ганчарствам ніхто ўжо не займаецца. Ганчары з іншых мясцовасцей Гайнаўшчыны таксама перасталі выконваць гліняны посуд.

Маладым людзям спадабалася работа з глінай (пры коле)

— У нашым музеі ёсць многа даўніх гліняных вырабаў, сярод якіх знаходзяцца „сівакі" (посуд сівага колеру, што выконваўся між іншым на Гайнаўшчыне) і паліваны посуд, які прывозіўся з Беларусі, — паінфармаваў дырэктар музея Ян Карпюк. Ганчар Міраслаў Пяхоўскі прывёз невялікае кола, на якім перад публікай стаў рабіць з гліны збанкі. Расставіў ён таксама гліняныя вырабы, выкананыя паводле сучасных патрабаванняў, якія прадае ў магазінах з кветкамі і дэкаратыўным посудам. Рамеснік паінфармаваў, што апошнім часам узрастае запатрабаванне на гліняныя вырабы і нават яго сусед адкрыў невялічкае прадпрыемства, якое масава стала выпускаць гліняны посуд. Можна паставіць пытанне: чаму ў цяперашніх спрыяльных умовах, калі турысты масава наведваюць Белавежскую пушчу ды яе наваколле і маглі б стаць пакупнікамі гліняных вырабаў, не вярнуцца да традыцыйнага ганчарства або стылізаваць прадукцыю на даўнюю?

— Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі хоча адрадзіць ганчарства ў Кляшчэлях, якія ў мінулым славіліся глінянымі вырабамі. Ёсць таксама задума намеціць па Белавежскай пушчы і яе наваколлі культурны шлях, накшталт прыродазнаўчых шляхоў, на якім можна было б памясціць ганчарскія варштаты ў Кляшчэлях. Вырабы народных творцаў маглі б не толькі паказвацца, але і прадавацца, — з адказам на мае разважанні прыйшоў гайнаўскі мастак Віктар Кабац. — З ганчарскай справай я меў нагоду пазнаёміцца будучы дырэктарам Гайнаўскага дома культуры (перад Міколам Бушко). На фэст арганізаваны ў Лешуках прыбыў са сваім абсталяваннем ганчар з Лукі, які заняў палову панадворка. Расставіў ён вялікае ганчарскае кола і стаў выконваць гліняны посуд, а свае вырабы ставіў на дубовай, змочанай вадой, дошцы. Былі гэта „сівакі", якія набіраліся сівага колеру толькі пасля выпальвання ў спецыяльных печках, дзе дым адыгрываў вялікую ролю ў працэсе мацавання гліны. Кляшчэлеўскія гаршкі выпальваліся крыху іншым спосабам і былі найчасцей чорнымі.

У наваколлі Гайнаўкі можна яшчэ і цяпер знайсці чорныя і сівыя гаршкі, збанкі, дваяны і іншы гліняны посуд. На паддашках можна таксама знайсці гліняныя паліваныя вырабы, якія прывозіліся ад вонкавых выканаўцаў.

— У Тыневічах гліняны посуд прадавалі ганчары з Нарвы. Гандляры з гэтай мясцовасці прывозілі таксама сінюю глінку, якой мы перад святамі мазалі сцены. Глінай падмазваліся таксама печы, пакуль не сталі ў нас прымяняцца кафлі. У будаўніцтве гліну дабаўлялі да саломы, якой прыкрывалі невялікія паверхні, напрыклад, куратнікі, — расказала пасля выступлення Ніна Хворась са „Збучанак", маладосць якой прайшла ў Тыневічах. У мінулым людзі лічылі, што гліняныя вырабы вельмі добрыя для захоўвання малака і іншых харчпрадуктаў. Мае суразмоўцы не ўспаміналі пра гліняныя падлогі, бо толькі іх мамы або бабулі маглі б помніць паўсюдныя ў мінулым такі.

Гайнаўскую моладзь сустрэў я побач вядучага практычныя заняткі ганчара. Знайшліся адважныя асобы, якія паспрабавалі выканаць гліняны посуд з выкарыстаннем кола. Спачатку прыглядаліся яны працы прафесійнага ганчара, а пасля, карыстаючыся яго падказкамі, паспрабавалі выканаць з падрыхтаванай загадзя гліны збанкі. Больш людзей сабралася побач гліняных вырабаў, калі закончыліся выступленні музычных калектываў.

— Калі я жыў у Лешуках, карысталіся мы дваянамі, верціхамі і рознымі глінянымі гаршкамі, — сказаў Аляксей Харкевіч. Успамінамі вярталіся ў мінулае таксама іншыя старэйшыя ўдзельнікі этнаграфічнага фэсту.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

ЧАРОМХАЎСКАЙ ЧЫГУНЦЫ 100 ГАДОЎ

Сёлета Чаромха адзначае стогадовы юбілей чыгуначнага вузла. Вось некалькі картак з гісторыі, якія захаваліся ў памяці работнікаў чыгункі.

Трыццаць гадоў таму жыхар Кузавы **Ян Рэпка** так мне гаварыў:

— Калісь мне бацька расказваў, што ў 1876 ці 1877 годзе (дакладна не памятаю) праз Чаромху прайшоў першы поезд з Брэста ў Беласток. З таго часу бярэ пачатак гісторыя нашай чыгункі. Чаромха была толькі пралётнай мясцінай на шляху Брэст — Беласток. У 1901 годзе ў Чаромсе пачалі класці чыгуначныя рэйкі. Праз тры гады пайшлі паязды з Седльцаў у Балагое цераз Ваўкавыск. Гэта ўжо была новая лінія. Была ў нас прыгожая станцыя — мураваная, з чырвонай цэглы... Пры царскай Расіі толькі некалькі чалавек працавала на чыгунцы: дзяжурныя па станцыі, стрэлачнікі, сцэпшчыкі і яшчэ некалькі чалавек. На Грамніцы, 15 лютага 1919 года ў Чаромху прыйшоў першы польскі паравоз. У тым жа годзе адкрываецца паравознае дэпо і склад паліва...

Аповед старажыла папаўняюць звесткі і архіўныя здымкі, якія захоўваюць члены таварыства „Прыязны транспарт" і якія былі змешчаны ў буклеце „Чаромха і наваколле", прысвечаным слаўнаму юбілею. Вось некаторыя важнейшыя даты:

— У 1905 годзе была закончана пабудова двух мураваных дамоў, гэтак званых „кашарак", якія зараз знаходзяцца па вуліцы Ліпавай.

— У 1906 годзе была адкрыта чыгуначная магістраль Седльцы — Чаромха — Гайнаўка — Ваўкавыск — Ліда — Полацк. З таго часу чарамшане лічаць пачатак чаромхаўскага чыгуначнага вузла.

— У 1907 годзе здаецца ў карыстанне паравознае дэпо.

— 2 верасня 1939 г. немцы кідаюць бомбы на Чаромхаўскую станцыю.

Аб пасляваенных буднях Чаромхі-Станцыі расказалі мне колішнія працаўнікі паравознага дэпо і гандлёва-перавозачнай службы:

Юзэф Дубковіч (1927 г. нар.), былы старшыня прафсаюзнай арганізацыі ў паравозным дэпо: — У 1949 было здадзена ў карыстанне новазбудаванае паравознае дэпо, а ў 1952 годзе воданапорная вежа і вадакачка пры вузкакалейцы. У 1969-1972 гадах праводзілася разбудова паравознага дэпо.

Чаромхаўскія чыгуначнікі ў 1930-ых гадах

Вацлаў Рыдаль (1921 г. нар.), пенсіянер-машыніст: — Працу на чыгунцы ў якасці перагрузчыка пачынаў я будучы падросткам разам з братамі Станіславам і Янам Александровічамі. Затым працягваў я працу пры саветах і ў час нямецкай акупацыі. Захаваўся мне ў памяці такі эпізод. Кіравалі мы з памочнікам машыніста таварным цягнікам, які падаваўся ў Ваўкавыск. На лініі Гайнаўка — Нараўка пад пуцямі была падложана міна. Цягнік быў узарваны. Першым у адкос зваліўся паравоз, затым вагоны. У аварыі мы не пацярпелі, адно галава ў мяне была разбіта. Невядома чыіх рук была гэта работа. Пуць хутка адрамантавалі. Пасля вайны рабочы калектыў у нашым дэпо складалі трыццаць каманд з двух чалавек кожная. Вадзілі мы цягнікі з Чаромхі ў Плятэраў і назад, а таксама з Чаромхі ў Свіслач. Начальнікам быў Маеўскі — не мясцовы, прыезджы. Да васьмідзесятых гадоў Чаромха лічылася квітнеючым чыгуначным цэнтрам. Рух таварных паяздоў быў вялікі. У гэты час працаваў я машыністам на манеўрах. За дзяжурства прыходзілася расфарміраваць каля дзесяці саставаў парожніх вагонаў і сфармаваць столькі ж загружаных. Не было часу на адпачынак...

Чаромхаўскія чыгуначнікі ў пачатку 20-га стагодздзя

Мікалай Зінчук (1928 г. нар.): — На працу ў паравозным дэпо паступіў я ў 1951 годзе. У кастрычніку вярнуўся я з арміі, а з пачаткам снежня стаў працаваць работнікам у майстэрні. Кіраўніком нашым быў Гібак (бацька пазнейшага дырэктара насычальні Станіслава), а начальнікам дэпо быў Браніслаў Ажынскі. Рабочы калектыў налічваў каля двухсот чалавек. З майстэрні паслалі мяне на курсы машыністаў. Першнаперш працаваў я на паравозе Тг-12, пасля на амерыканскіх Тг-203 і нямецкіх Ту-2. Наша дэпо мела свой філіял у Гайнаўцы. Там знаходзіліся майстэрня і гаражы дызельнай цягі (MSCI), г.зв. „тарпедаў". Працай у філіяле кіраваў дыспетчар. У пачатках пяцідзесятых гадоў ездзілі мы на малых тарпедах, падобных на цяперашнія рэйкавыя аўтобусы з вагончыкам, затым атрымалі венгерскія „ганзы" (SN-81). На зломе 1969/1970 гадоў праходзіў я прафесіянальнае абучэнне машыністаў дызельнай цягі. Чаромха карысталася тады венгерскімі лакаматывамі SM-41, польскімі SM-42 ды савецкімі ST-44 („гагарыны"). Да 1956 года транзітныя цягнікі з Франкфурта ў Чаромху праводзілі нямецкія машыністы. У саставе знаходзілася „вяртушка" — жылы вагон для каманды поезда, якая змянялася на дзяжурствы кожныя восем гадзін. Ад 1956 г. па транзіт мы ездзілі ў Плятэраў, а з Высокага ў Чаромху цягнікі вадзілі савецкія машыністы. Ад 1970 года мы пачалі ездзіць у Высока-Літоўск.

Начальнік станцыі Ян Рынкевіч з сям'ёй, 1920 г.

Ілья Ляўчук (1930 г. нар.): — Працу на чыгунцы пачынаў я ў 1954 годзе як рабочы гандлёва-перавозачнай службы. Разам з іншымі займаўся перагрузкай збожжавых сервіровак. Кіраўніком канторы перадачы быў Уладыслаў Мудаль, а начальнікам станцыі — Аляксандр Туркевіч. Неўзабаве перавялі мяне на пасаду канторшчыка, затым паслалі ў Гайнаўку. Начальнікам станцыі ў Гайнаўцы быў Ежы Букач, а кантору перадачы ўзначальваў Васіль Такажэвіч. Тры гады даводзілася мне даязджаць на працу. Пры канцы 1957 года вярнуўся я ў Чаромху і стаў працаваць агентам у канторы перадачы. Працы ў Чаромсе было шмат. Дзесяць гадоў ездзіў я ў Свіслач, дзе афармляў дакументы на здачу таварных паяздоў савецкім агентам. На дзяжурства падаваўся я разам з вагоннікам. Нам у суткі плацілі па 3,40 рубля каманцдзіровачных. Пашпартна-мытны кантроль праходзілі мы ў Семяноўцы. З Чаромхі адпраўлялі пяць цягнікоў у Свіслач і дзесяць у Высока-Літоўск (столькі ж было паяздоў на прыёме з другога боку).

З Ільёй Ляўчуком прыходзілася і мне працаваць у канторы перадачы ў Чаромсе на зломе сямідзесятых і васьмідзесятых гадоў. Тады працы канторшчыкам было хоць адбаўляй. Ад Седльцаў па Навасады на прыём у Чаромху чакалі транзітныя цягнікі. З ГДР у Савецкі Саюз перавозіліся рознага віду тавары, пачаўшы з сельскагаспадарчых машын, а на электратэхніцы і гарэлцы закончыўшы. З Польшчы ў Свіслач найбольш адпраўляліся фарбы для суднаў, трыкатажныя вырабы, вопратка і касметыка. Апрача таварных паяздоў шмат праходзіла вайсковых эшалонаў. Гэтыя карысталіся прывілеямі і зразу афармляліся дакументы на здачу. Паколькі ў мінулым здараліся выпадкі прымянення зброі нецвярозымі савецкімі вайскоўцамі (пасля вайны застрэлілі аднаго чарамшаніна на пуцях, затым чаромхаўскага кандуктара на станцыі Плятэраў), арганізавалася камендатура савецкіх войск у Польшчы, якая сачыла за праездам эшалонаў — ЗКУ. Аддзяленне гэтай установы ў пазнейшы час знаходзілася і ў Чаромсе. Для ЗКУ ў Чаромсе чыгун-

працяг ☞10

Match.by

прямые трансляции

http://www.match.by

Пэўна, сярод усіх спартыўнах заўзятараў найбольшую колькасць складаюць футбольныя. Да таго ж яны не толькі найбольш шматлікія, але і самыя актыўныя і агрэсіўныя. Дастаткова ўзгадаць англійскіх балельшчыкаў, якія рэдка калі даюць спакою паліцыі тых замежных гарадоў, куды прыязджае іх футбольная каманда.

Беларускія футбольныя заўзятары, вядома, з англійскімі ні ў якое параўнанне не ідуць — яны даволі ціхія і паслухмяныя. Можа сапраўдных фанатаў футбола сярод іх нямнога, а можа неяк больш талерантна ставяцца да магчымых выйгрышаў ці пройгрышаў сваіх куміраў? Так ці інакш, але футбол беларусы любяць як і іншыя людзі планеты. Таму сёння, акурат падчас правядзення гульняў еўрапейскай футбольнай Лігі чэмпіёнаў, варта зазірнуць на сайт беларускіх футбольных заўзятараў, які месціцца па адрасе **http://www.match.by**.

Сайт зроблены зусім нетыпова. Яго выяўленне нагадвае нейкі радыёпрымач, кнопкі якога ёсць выйсцямі да асобных рубрык. А галоўная яго функцыя — наўпроставая трансляцыя матчаў.

„Вітаем на новай бачыне байнэту — **match.by** — створанай адмыслова для правядзення інтэрнэт-трансляцый футбольных матчаў з удзелам беларускіх камандаў, — прамаўляюць да віртуальных вандроўнікаў распрацоўшчыкі сайта. — Наўпроставая трансляцыя на **match.by** — гэта падрабязны штохвілінны каментар да падзеяў на полі, онлайн-абнаўленні паказнікаў матча (карткі, удары па варотах, небяспечныя моманты, замены, валоданні мячом і г.д.). Падчас эфіру гледачы **match.by** могуць абменьвацца ўражаннямі ад гульні ў жывым чаце".

Ніжэй падаецца табліца вынікаў гульняў як еўрапейскіх турніраў, так і ўласна беларускага чэмпіяната.

Цяпер пройдземся па рубрыках, якія хоць і не вельмі шматлікія, але насычаныя даволі цікавай для аматараў футбола інфармацыяй.

Старонка „Журнал" змяшчае невялікія расповеды аб некаторых гульнях, якія, па меркаванні распрацоўшчыкаў сайта, вартыя ўвагі заўзятараў. Чытаць гэтыя каментарыі варта пачынаючым каментатарам футбольных матчаў, а таксама журналістам, якія мяркуюць авалодаць майстэрствам спартовага аглядання.

Рубрыка „Трансляцыі" дае магчымасць прасачыць ледзьве не за кожнай хвілінай матчаў, якія месцяцца ў табліцах шэрагу футбольных спаборніцтваў. Цікава, што да кожнага матча дадаецца інфармацыя пра склад камандаў, а таксама г.зв. статыстыка, якая адлюстроўвае колькасць парушэнняў, вуглавых удараў, галоў і гэтак далей, — дакладней, усяго таго, што сцісла характарызуе кожную гульню.

Свайго роду працягам папярэдняй рубрыкі ёсць старонка „Календары і вынікі". Тут таксама месцяцца вынікі прайшоўшых матчаў на розных футбольных турнірах і чэмпіянатах, а таксама паведамляецца аб даце бліжэйшых гульняў. Праўда, з большага гэта тычыцца Чэмпіянату Беларусі і „Еўра 2008".

Аб тым, хто запусціў гэты сайт у сусветнае павуцінне, нідзе не паведамляецца. Нічога дзіўнага — пэўна, карыстальнікі байнэта ўжо звыкліся з тым, што распрацоўшчыкі сайтаў у сваёй бальшыні хочуць застацца інкогніта. Можа, каб крыху развеяць гэтую таямнічасць, у рубрыцы „Пытанні і адказы" аўтары **match.by** троху распавядаюць аб сваіх памкненнях і нават запрашаюць да супрацоўніцтва ў асвятленні футбольных спаборніцтваў.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

„Сідар" супраць „Захара"

Пасля летніх месяцаў перапынку настала пара расказаць пра справы беларускага хакея, від, які мае ў краіне найбольшую дзяржаўную і фінансавую падтрымку. Сезон пачаўся з розыгрышу Кубка Беларусі. У фінальным матчы „Гомель" адолеў мінскі „Керамін". Перамога ўсходнікаў сталася для іх пэўнай эйфарыяй, бо ў чэмпіянаце краіны гомельцы стартавалі зусім няўдала і прадаўжаюць гуляць невыразна. Удзел у бягучым першынстве бяруць 10 камандаў — сталічныя „Юнацтва", „Дынама" і „Керамін", „Гомель", гродзенскі „Нёман", магілёўскае „Хімвалакно", „Віцебск", наваполацкі „Хімік-СКА", жлобінскі „Металург" і „Брэст". Асаблівы інтарэс выклікае супрацьстаянне мінскіх „Юнацтва", якое даўно трэніруе Міхаіл Захараў і „Дынама", якое нядаўна ўзначаліў Андрэй Сідарэнка. Калісьці, на золку суверэнных гадоў, Захараў, які тады яшчэ гуляў за зборную, выступіў ініцыятарам так званага „Ліста 23-х", у выніку якога галоўны трэнер Сідарэнка пазбавіўся паста галоўнага трэнера нацыянальнай дружыны. Пасля гэтага апальны трэнер многа і паспяхова працаваў у Польшчы, потым у Расіі і нарэшце вярнуўся да родных пенатаў. Прыйшла пара своеасаблівага рэваншу? Інтарэс да дуэляў трэнераў-антаганістаў дадае і той факт, што абодва клубы маюць апеку высокіх дзяржаўных чыноўнікаў — „Дынама" курыруе МУС на чале з самым Уладзімірам Навумавым (старшыной хакейнай федэрацыі), ну а Захараў заўсёды быў блізкі да атачэння Аляксандра Лукашэнкі. Што датычыць самых хакеістаў, то падаецца, што падбор кадраў мацнейшы ў „Юнацтва".

Ну а найлепш узяў разгон пакуль мінскі „Керамін", яшчэ адзін прэтэндэнт на золата першынства. Крыху нечакана ўдала стартавалі „Віцебск" і „Нёман", якім адводзілі ролі статыстаў. Пасля шасці-сямі гульняў становішча ў стане лідэраў даволі шчыльнае, так што глыбокія высновы пакуль рабіць рана.

Дэсант беларускіх легіянераў у расійскай суперлізе значна скараціўся. Усяго на бяскрайніх прасторах усходняй суседкі зараз на працу ўладкавана сямёх беларускіх хакеістаў — Алег Антоненка, Канстанцін Кальцоў, Алег Белкін, Аляксей Калюжны, Аляксей Угараў, Марат Аскараў і Андрэй Мезін. Гуляюць яны ў розных клубах, Антоненка і Калюжны нават верхаводзяць у сваіх камандах. Нядаўні капітан беларускай зборнай Антоненка ўваходзіць у лік лепшых бамбардыраў чэмпіянату. А вышэй іншых з „нашых" у табліцы стаяць пакуль уфімскі „Салават Юлаеў", колеры якога бароніць форвард Кальцоў і магнітагорскі „Металург", браму якога сцеражэ Мезін, які прапускае найменш з усіх галкіпераў расійскай суперлігі.

А вось палку айчынных хакеістаў за акіянам пабольшала. Усе чакаюць паўнацэннага сезона за „Манрэаль канадыенс" нападніка Андрэя Касціцына. Павінна „прарваць" і форварда Міхала Грабоўскага. У стане „Манрэалю" пакуль і малодшы Касціцын — Сяргей. Па-ранейшаму ў складзе „Флорыды Пантэрс" наш старажыл НХЛ — абаронец Руслан Салей. А вось галоўная „зорачка" айчыннай гульні нумар адзін, 17-гадовы форвард Міхал Стэфановіч прыехаў у Канаду выступаць пакуль за юнацкую каманду горада Квебек. І паспяхова ў ёй дэбютаваў. Мяркую, яго матчы ў мацнейшай лізе свету не за гарамі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

9 ☞ працяг

ЧАРОМХАЎСКАЙ ЧЫГУНЦЫ 100 ГАДОЎ

ка пабудавала тры жылыя карпусы, дзе да канца васьмідзесятых гадоў пражывалі афіцэры з сем'ямі. У канторы перадачы дзяжурылі пазменна. З Высока-Літоўска прыязджалі савецкія агенты г.зв. „Асяй" — дрызінай. Прыпамінаецца мне адно здарэнне з таго часу. Калі я пайшоў спісваць санітарны поезд (такімі перавозілі хворых салдат з ГДР на лячэнне ў Савецкі Саюз), дык спыніў мяне вокліч вартаўніка. Вайсковец не дазволіў мне варухнуцца з месца. На марозе я вымушаны быў прастаяць больш чым паўгадзіны, пакуль не з'явіўся начальнік эшалона. Пасля маіх тлумачэнняў хто я такі і чым займаюся, дазволілі мне спісаць поезд. Аб здарэнні я, разумеецца, зразу па тэлефоне перадаў дзяжурнаму афіцэру ЗКУ. З таго часу начальнікам эшалонаў зэкаўчнікі інфармавалі хто з чыгуначнікаў можа набліжацца да вайсковых паяздоў. Найбольш вайсковых складоў праходзіла ў летні час, калі салдат накіроўвалі на ўборку ўраджаю. Чаромхаўскім чыгуначнікам было тады сапраўднае „жніво", паколькі з салдатамі займаліся абменам таварамі. За кашалёк з фота маргаючай японкі давалі па „чырвонцы" — дзесяць рублёў. За калоду парна-карт для гульні давалі нават па 20-25 рублёў. На станцыі квітнеў гандаль. Запамяталася мне яшчэ іншае здарэнне, калі савецкі прапаршчык, армяшка Эдзік, закахаўся ў нашу канторшчыцу. Не толькі ён прызнаўся ёй ў каханні, але і хацеў жаніцца. Абяцаў забраць яе ў Армнію. Гаварыў, што ён адзін у бацькі і маюць яны вялікі вінаграднік. Паняй у хаце будзе. Дзяўчына аднак не адважылася. Калі гэта яму выявіла, прапаршчык па п'янаму ўчыніў скандал, за што пасля вышвырнулі яго са службы.

Станцыйны калектыў на фоне вакзала, міжваенны перыяд

Так даўней квітнела наша чыгунка. У Цэнтральнай чыгуначнай дырэкцыі была яна любімчыкам, паколькі карысталася двума пагранічнымі пераходамі: Чаромха — Высока-Літоўск і Чаромха — Свіслач. За яе змагаліся начальнікі з Седльцаў і Беластока. Яшчэ ў васьмідзесятых гадах чаромхаўскі вузел налічваў каля паўтары тысячы працаўнікоў усіх чыгуначных службаў. Гэта быў дружны рабочы калектыў, быццам адна сям'я. Калі з вузлавога камітэта ПАРП паступіла прапанова аб пабудове чыгуначнай станцыі ў гонар X з'езда партыі, дык усе станоўча адклікнуліся прыняць актыўны ўдзел. Дзякуй самаахвярнай працы рабочага калектыву і выдатнай грашовай успамозе чыгуначных улад па сённяшні дзень захавалася памятка мінулага — новы будынак вакзала, на жаль, чыгунцы зараз непрыдатны (аб'яўлены ўжо аўкцыён на яго продаж). Цяпер у трохпавярховым будынку працаўнікоў можна палічыць на пальцах. Ды і станцыя пусцее. Ці штосьці пераменіцца ў Чаромсе ў бліжэйшы час, цяжка сказаць.

Уладзімір СІДАРУК

(здымкі з дамашніх архіваў чарамшан)

„Е ў Добрыводы ...”

Е ў Добрыводы грудочок, грудочок
Увыла Манёчка выночок, выночок
Як увывшы заснула, заснула
выіхав Іванко — ны чула, ны чула
Спы, спы Манёчка, здорова, здорова
прывэзу выночка зэ Львова,
зэ Львова
Як сама ны хочэш, ны хочэш
— сыстры дай, сыстры дай
сама молодая — мный зостань,
мный зостань

(З „Рэпертуару фальклорнага калектыву з Дабрывады”, сшытак № 12, пад рэдакцыяй Сцяпана Копы, выдадзены ВАА Кам у 1994 г. да 25-годдзя калектыву)

Добраўпарадкаваны стары могільнік

Фактычна, ёсць у Дабрывадзе не толькі грудочак, але зусім вялікі грудок, з якога ўнізе распасціраецца вёска з яе вуліцамі і вулачкамі. Так што невядома, чаму якраз Кляшчэлі атрымалі гарадскія правы. Па-мойму, Кляшчэлі ляжаць каля Дабрывады, а не наадварот. Не дарма людзі пасяліліся каля крыніцы, з якой выплывае рэчка Дабраводка. Найстарэйшыя дабрывадцы не памятаюць, калі зімой яна замярзала — затым зімой і летам разгравала яна ўсіх ахвотных. Праўда, цяпер з крыніцы выплывае добрая, зімная вадзічка, але калісь...

Так што з аднаго боку Дабрывады маем грудочак, з другога — у рэчышчы Дабраводкі — лугі, а далей за лугамі лес, а між лесу на паляне, дзесьці на мяжы Кляшчэлеўскай і Чаромхаўскай гмін, распаложаны Рэпчычы з вадасховішчам. Можна сказаць, што вёска прытулілася да грудочка, які засланяе яе перад зімнімі паўночнымі вятрамі, і з усходу да пушчы, таксама невядома чаму названай Белавежскай, калі да Белавежы го-го колькі вёрст. Каб не насып чыгункі Гайнаўка — Чаромха, які раздзяляе Дабрываду ад пушчы, то невядома ці акурат пушча называлася б Белавежскай.

У Дабрывадзе дзейнічае фальклорны калектыў, які за год будзе адзначаць саракагадовы юбілей і які ў сваім рэпертуары мае старадаўнія беларускія песні, сабраныя і выдадзеныя Сцяпанам Копам.

У Дабрывадзе працуе ўжо некалькі агратурыстычных кватэр. Ёсць і турыстычныя атракцыёны: пірамі да — не трэба ехаць у Егіпет, каб не толькі пабачыць, але і знутры яе наведаць.

Перад усім ёсць людзі, якія дбаюць пра культурную спадчыну свайго народа, аб чым сведчаць, напрыклад, захаваныя песні і добраўпарадкаваны стары могільнік.

Не толькі я захоплены Дабрывадай, але і турысты, якія часта наведваюць агратурыстычную кватэру спадарства Зіневічаў.

Ёсць у Дабрывадзе і гравійны кар’ер, так што замала сказаць што тут вельмі здаровая вада, але і здабыўная прамысловасць.

Тэкст і фота Міхася КУПТЭЛЯ

Штогод на канікулы

Казімеж Баровец, акцёр Старога тэатра ў Кракаве, разам з жонкай Евай на канікулы прыязджаюць у Трасцянку, што ў Нарваўскай гміне. Пастаянна кватаруюцца яны ў Анастасіі Паўлючук, непадалёк сядзібы Галены Тапалянскай, з якой шчыра пасябравалі, і там вучацца беларускай мове. Хачу адзначыць, што спадар Казімеж шмат гадоў таму працаваў у Беластоцкім тэатры. Спадарству Бароўцам вельмі падабаецца Беласточчына, асабліва вёскі на Усходняй сцяне. Падабаюцца жыллёвыя драўляныя хаты ды чыстае паветра. Прыязджаюць сюды на машыне, а потым на веласіпедах аб’язджаюць навакольныя вёскі і фатаграфуюць цікавыя помнікі старадаўнасці. Штогод наведваюць таксама мяне, каб за шклянкай гарбаты ці кавы пагутарыць аб жыцці. У гэтым годзе, пад канец канікулаў, прыехалі яны да мяне на раварах. Я адразу адчуў, што штосьці не так і адразу спытаў, што здарылася? Яны расказалі мне, што едучы праз Бялкі ўбачылі прыгожых коней Міхала Трафімюка і зрабілі здымак. Потым, калі праехалі суседнюю вёску Каўпакі і намерваліся падацца ў Патоку, што ў Міхалоўскай гміне, то на сенажаці пры дарозе пабачылі ўвязаную на ланцугу кабылу з маленькім жарабяткам. Яны затрымаліся паглядзець і тады малое жарабятка падышло да іх. Спадарыня Ева паглядзіла яго і хацела зрабіць здымак. Гаспадар пабачыў іх са свайго панадворка і на мапедзе прыехаў да іх. Пачаў крычаць, абзываць іх зладзеямі, што робяць здымкі, што... вырабяць пашпарты, а потым украдуць коней.

Спадарства Бароўцы пачалі тлумачыцца, што яны прыехалі на адпачынак у Трасцянку, што добра ведаюць спадарыню Галену Тапалянскую, а ў Бялках — мяне ды майго сына Мікалая, які пражывае на хутары ў Малынцы (нават паказалі хату, бо адтуль было яе відаць). На жаль, не памаглі ніякія тлумачэнні. Дачка гаспадара патэлефанавала ў паліцыю ў Заблудаў. Там адказалі, што калі будзе магчымасць, дык прыедуць. Быў ужо пасляабедні час і спадарства Бароўцы апасаліся, што прыйдзецца доўга чакаць прыезду заблудаўскай паліцыі. Тады пані Ева Баровец патэлефанавала ў Кракаў у паліцыю, усё расказала і папрасіла дапамогі. Паліцыя з Кракава скантактавалася з беластоцкай паліцыяй, просячы высветліць справу. Прыехаў паліцыянт з Заблудава і аказалася, што ён ведае спадарства Бароўцаў, а яны — яго маці, але ўсё фармальна мусіў апісаць. Паліцыянт перапрасіў спадарства Бароўцаў, але ўласнік коней не азваўся ні словам (прозвішча гэтага гаспадара не выяўляю). Вось, даражэнькія, якія людзі ў нас бываюць.

Мікалай ЛУК’ЯНЮК

1 ☞ працяг

Ніякожыстнэ людзі

цавала дазваніцца ў канцылярыю, там адразу сказалі званіць на іншы нумар. Такім чынам, у адной справе, я была вымушана выканаць аж сем тэлефонаў! Кашмар.

* * *

Пра надыходзячы падзел жыхары Жытняй даведаліся праз чуткі ад людзей на рынку. Праз некалькі тыдняў не было іншай тэмы. Чаму не праводзяць ніякай кансультацыі, рэферэндуму — абураліся на рынку! Прыналежнасць да новай парафіі не захапляла нават саміх відаўцаў. Сваю могільнікавую капліцу яны пабудавалі на ўласны кошт, каб лягчэй было хаваць нябожчыкаў. Для бяльшчан прыналежнасць да бельскай царквы азначала працяг шматвяковай традыцыі і прэстыж.

— Таму ніхто не прызнаецца хто вырашыў, каб прыдзяліць нас да Відава, — мяркуе Марыя Голец. І цяпер кожны гэтую справу адпіхвае ад сябе. Спачатку новы благачынны хацеў усё спіхнуць на Варшаву. — То як гэта, мітрапаліт Сава быў на нашай вуліцы і мы пра гэта не ведалі? — абураецца спадарыня Голец. І адразу пазваніла мітрапаліту. У канцылярылі пачула зусім іншае. Што ўсе планы былі зроблены ў іх парафіі. Мітраполія іх толькі адобрыла. Значыць, уся справа ўжо *заклепаная* і няма тут павароту.

Жыхары вул. Жытняй атрымалі адказ на свой першы ліст. Праўда, найперш узнікла сумненне — ці ён сапраўдны?! У лісце няма ні подпісу, ні пячаткі. Матывіроўка прыналежнасці да новай парафіі выкладзеная ў чатырох пунктах:

„I. Otwarcie każdej nowej jednostki parafialnej jest radością Cerkwi, świadczy bowiem o Jej żywotności.

II. Ubolewam, że autorzy pisma, wierni prawosławni, nie cieszą się radością swej Matki i nie chcą służyć Jej pomocą.

III. Taki a nie inny podział ulic, w związku z nowopowstałą parafią w Widowie, został dokonany po konsultacji z proboszczami Bielska.

IV. W nabożeństwach uczestniczyć można i w innych parafiach natomiast posługi religijne sprawuje proboszcz w Widowie.

+ Metropolita Sawa. 29.VIII.2007”.

Ліст канцылярыя выслала не на прозвішча адрасата, а на яго суседа. З-за гэтай, здавалася б, дробнай недакладнасці ўзніклі вялікія эмоцыі. Справа ў тым, што між суседзямі няма найлепшых адносін. Пісьмо дайшло ў рукі адрасата толькі пасля просьбы суседзяў, якія разам падпісаліся пад прашэннем.

— Чаму вы не паказалі ліста суседцы? — спыталі мы пенсіянерку Марыю Саевіч.

— Бо я не хачу мець з імі справы, — сказала ў адрас аўтараў падзелу. — Хай сабе робяць што хочуць! А да Відава і так не пайду, каб там было *неведзь-што!*

* * *

Новы благачынны Лявонцій Тафілюк з маршу хацеў мяне перадаць у рукі мітраполіі. Пасля яшчэ рашуча забараніў займацца гэтай справай.

— To są sprawy Cerkwi i proszę się nie wtrącać! Te kwestie nie są do dyskusji.

— Tu chodzi o sprawy ludzkie. Trzy osoby przydzielone do parafii Widowo chodzą o kulach. I przydzielono ich do parafii, gdzie jest dwa razy dalej...

У адказ ксёндз-дэкан спрабаваў мне даказаць, што ў Відава бліжэй чым у царкву па вул. Траўгута. І строга загадаў:

— Proszę to zostawić! Proszę się nie wtrącać w sprawy Cerkwi!

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 350 egz.

ЗАПРАШЭННЕ

Пасольства Беларусі ў Польшчы, Генеральнае консульства Беларусі ў Беластоку, Цэнтр праваслаўнай культуры ў Беластоку і Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы запрашаюць на

Другі вечар беларускай культуры,

які адбудзецца **12 кастрычніка 2007 года а 17-ай гадзіне ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку, вул. св. Мікалая, 5.**

У праграме:

— фрагмент спектакля Беларускага паэтычнага тэатра аднаго акцёра „Зьніч" „Пачакай сонца!",

— адкрыццё мастацкай выстаўкі графікі і керамікі „Лінія і формы" мастакоў Уладзіміра і Тамары Васюкоў (г. Мінск),

— прэзентацыя кнігі „Славянскі світанак" з удзелам аўтара Рышарда Курыльчыка, перакладчыка Анатоля Бутэвіча і дырэктара выдавецтва „Чатыры чвэрці" Ліліяны Анцух (г. Мінск),

— выступленне Заслужанага аматарскага калектыву Беларусі ансамбля беларускай музыкі і песні „Паазер'е" (г. Паставы, Беларусь),

— выстаўка-продаж беларускай літаратуры і сувенірнай прадукцыі

— дэгустацыя беларускіх нацыянальных страў.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

— Вы забылі заплаціць! — крычыць выходзячаму з рэстарана спажыўцу афіцыянт.

— А я на тое і піў, каб забыць.

* * *

Ксёндз наведвае з візітам новага парафіяніна.

— Колькі ў цябе, сыне, дзяцей? — пытае.

— Двое: дачка і сын.

— Ці не сорамна табе? Такі волат і толькі двое дзяцей!

— Сорамна. Але няхай ваша вялебнасць ветліва ўлічыць, што я жанаты ўсяго толькі два тыдні.

Бедныя беларусы

Разам з пачаткам навучальнага года заўсёды прапануем школьнікам падпісацца на наш тыднёвік. За сімвалічную залатоўку. Газету з карысцю можна палічыць дапаможнікам на ўроках беларускай мовы, гісторыі, на занятках па рэгіянальнай тэматыцы, мастацтве...

— Не, бо мы бедныя! — чую закаранелы адказ.

Пра беларускую бяду я чую ўжо трынаццаць гадоў, бо столькі часу на грамадскіх пачатках займаюся прамоцыяй „Нівы" і „Зоркі". Няважна, што за той час людзі разбагацелі, абставіліся электронікай і памянялі старыя машыны на навейшыя мадэлі. Амаль кожнае дзіця мае ў хаце камп'ютэр, мабільнік, MP3-плэер. Сярод абавязковых рэквізітаў з'яўляюцца ролікі, ровары ці модныя ў апошні час (асабліва на вёсках) матарынкі. Словам, моладзь загружаная па шыю каштоўнымі цацкамі. Калі ідзе пра адукацыю — тут вырашае прагматызм. Без агляднкі бацькі купляюць дапаможнікі для вывучання англійскай мовы. Як правіла, выкупляюць яшчэ дадатковыя ўрокі па англійскай мове. Дзеля апошняй справы часта бяруць крэдыт у банку.

— Усё гэта дзеля будучыні, — кажуць заклапочаныя.

— А чаму не хочаце падпісацца на „Ніву"? — пытаю людзей на даволі высокім бытавым узроўні. — „Ніва" дапамагае ў самаадукацыі, прапануе розныя формы супрацоўніцтва, конкурсы, не гаворачы ўжо пра інфармацыю з жыцця нашай грамадскасці. Веданне мовы і праблематыкі вялікі капітал у будучыні. У сітуацыі афіцыйнага двухмоўя (да якога калісьці дарасцем) кожны казённы чыноўнік ці працаўнік публічнай адміністрацыі будзе абавязаны вывучыць мову. Цікава, што нават апошні аргумент не заходзіць у галаву нашых бедных людзей:

— Усё гэта праўда, — скажуць, — але ў нас няма за што, самі разумееце...

Апошні адказ добра разумею і лічу праўдзівым. Бо тут ідзе ў асноўным пра духовую нэндзу. Нягледзячы на знешнюю ўпакоўку (апранахі сусветных фірм, навейшыя машыны, экзатычныя віды раслін у агародчыках) наш чалавек астаецца непісьменным у сваёй роднай культуры.

— Каб прачытаць адну „Ніву" мне трэба тыдзень часу, — прызнаецца знаёмы выпускнік белліцэя.

Каб прачытаць тыднёвік на польскай мове мой субяседнік патрабуе дзве-тры гадзіны. Культура (між іншым веданне роднай мовы) з'яўляецца вызначальнікам грамадскага і эканамічнага развіцця народа. У нашым выпадку — выходзіць адна галеча.

— А што мне дасць тая беларускасць? — паўтараюць.

Дзеці, як вядома, мімавольна адлюстроўваюць хатнюю сістэму вартасцей. Часта пытаю пра мары маладых беларусаў. Што хочуць рабіць у дарослым жыцці? Найчасцей чую адзін адказ:

— Nie wiem co będę robił, wiem tylko, że chcę być bardzo bogaty!

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

30.09 – 06.10

Баран (22.03. — 20.04.) Гоніш астаткам сілы; можаш трапіць у хандру або захварэць на ляноту. А, папраўдзе, прыдаўся б табе салідны адпачынак. Больш часу прысвяці асабістым справам. Не пазычай без пацвярджэння.

Бык (21.04. — 21.05.) Зважай, бо можаш стаць залішне зайздросным! Не пераборшчвай! Добры час на выкарыстанне ўявы, мастацкіх талентаў, інтуіцыі. Можа сустрэць цябе штосьці вельмі мілае.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Зрабіць на кімсьці ўражанне, якое яго зваліць з ног — цяпер табе як плюнуць! Затое балаган у розных справах. У фінансах не разлічвай на нябесную манну. Весткі аб залатых горах — звычайная лухта, а стратаў, якія могуць чакаць з-за лішняга даверу, ніхто табе не кампенсуе.

Рак (23.06. — 23.07.) Знакаміты час, каб раскрунуць інтарэс. Добрая фізічная і псіхічная форма ды шчопаць шчасця. Задбай аб развой сваёй кар'еры. Варта інвеставаць, разгарнуць крылы. Насі з сабой золата (лепш схаванае!) — паправіць яно табе настрой і прынясе папулярнасць сярод новых асоб.

Леў (24.07. — 23.08.) Зразумееш, адкуль у цябе бяруцца праблемы. Настрой крыху меланхалічны. Не наракай на лёс, будзеш мець магчымасць зрабіць у жыцці пазітыўныя змены. Адно не бяры новых пазык!

Дзева (24.08. — 23.09.) Скажы партнёру, што цябе цешыць, што нервуе. Цяпер добра дагаворыцеся аб усім. Маеш недалёка магчымасці няблага зарабіць (купі большую скарбонку!).

Шалі (24.09. — 23.10.) Калі адчуеш, што аж цябе разносяць энергія ці нервы, вазьміся за падлогу! Працавіты тыдзень. Калі рыхтуюцца нейкія змены, будзь асцярожны, бо можа пры гэтым дайсці да канфлікту. Карыстайся ўсімі запрашэннямі — выхад з хаты паправіць табе настрой.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Спакойна справішся з праблемамі, захаваеш добрыя адносіны з іншымі. Напніся, падзейнічай, кіруючыся інтуіцыяй — зможаш паправіць свой бюджэт. Зважай, каб не трапіць у абдымкі неадказнай асобы!

Стралец (23.11. — 22.12.) На працы не пачынай звады, дыскусіі, зважай на інтрыгі. Не рассявай плётак! Прыцягваеш да сябе арыгінальных, прыгожых, цікавых асоб. Насі адзенне бэзавага колеру — спрыяць будзе гэта мілым адносінам атачэння.

Казярог (23.12. — 20.01.) Адкладзі набок калькулятар; пара паверыць інтуіцыі, прадчуванням і ўяве. Час спрыяе матэрыяльным і асабістым справам. Можа паправіцца ўзровень жыцця. Апранай адзенне малінавага колеру — паможа табе ў практычных дзеяннях!

Вадалей (21.01. — 19.02.) Венера паспрыяе табе ў выбары парфумы, прычоскі, новых заслон у хаце... Будзеш прыгожы, поўны энергіі, папулярны ў асяроддзі. Ды не сустракайся з асобай ужо звязанай. Сярэдні тыдзень у фінансах, дык не плануй выдаткаў з размахам.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Запрасі на гасціну ўсіх, каго любіш; гэта прынясе табе шчасце. Калі на працы з табой не лічацца, пацікаўся новымі прапановамі. Твая жывая інтэлігентнасць і новыя ідэі адразу звернуць на цябе ўвагу; будзеш мець немалыя шанцы. Насі фіялкавы шалік ці хустку — павесялееш, людзі будуць любіць тваю кампанію.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. сталіца Французскай Гвіяны, 2. установа з міністрамі, 3. верш з васьмі радкоў з дзвюма рыфмамі, 4. моцны рэзкі выгук голасу, 5. прыбаўка, 6. квадратны корань з чатырох, 7. масляністая вадкасць чырвона-бурага колеру, якая ўжываецца для дэзінфекцыі, 8. Віталь, беларускі жывапісец (1913-93), які пісаў пейзажы, нацюрморты, партрэты, 9. салодкая страва з тушонай морквы, 10. мюнхенская рака, 11. рэзкі вецер з гор у Альпах або на Каўказе; таксама электрычны прыбор для сушкі валос, 12. жыллё качавых народаў Паўднёвай Сібіры, 13. агародная расліна, якая прымушае плакаць, 14. вірусная хвароба з запаленнем дыхальных шляхоў і гарачкай, 15. расліна сямейства перцавых.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 34 нумара

Ака, здзек, ігра, канец, Комі, Літва, Мале, мама, рэвю, чатыры.

Рашэнне: **Амерыканец гэта чалавек з дзвюма рукамі і чатырма коламі.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

ISSN 0546-1960